Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 50 (3954)
СУБОТА, 21 ЛЮТАГА 1931 г.
Цана нумару 5 кап.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫННА

АДКРЫЎСЯ X ЗЬЕЗД САВЕТАЎ

Моваю лічбаў, прыкладамі самаадданай барацьбы за прамфінплян, за пралетарскую культуру

ПРАЛЕТАРЫЯТ І ПРАЦОЎНЫЯ МАСЫ БССР ВУСНАМІ СВАІХ ПРАДСТАЎНІКОЎ ПЕРАДАЮЦЬ ГАРАЧАЕ ПРЫВІТАНЬНЕ ЗЬЕЗДУ,

дэманструюць поўнае давер'е і адданасьць партыі і савецкай уладзе

У паход на дапамогу другой бальшавіцкай сяўбе

ЦК КП(б)Б У СВАЁЙ ПАСТАНОВЕ, надрукаванай у «Зьвязьдзе» ад 19 лютага, з усёй выразнасьцю ХАРАКТАРЫЗУЕ РАБОТУ ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА СЯЎБЫ, ЯК ЗУСІМ НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧУЮ. ЦК адзначае, што ДЫРЭКТЫВЫ ПАРТЫІ У ГЭТАЙ ГАЛІНЕ НЯ ВЫКАНАНЫ. НІ АДНО З АСНОЎНЫХ ПАДРЫХТОЎЧЫХ ГАСПАДАРЧЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ (ссыпка насенных і страхавых фондаў, ачыстка збожжа, рамонт, давядзеньне пасеўных плянаў, загатоўка насеньня і г. д.) у тэрмін не праведзена.

У цэлым радзе раёнаў падрыхтоўка да сяўбы зусім ня ўвязана з калектывізацыяй. Правааапартуністычны самацёк і бязьдзейнасьць паасобных партыйных арганізацый — асноўная прычына спагбага нарастаньня тэмпаў калектывізацыі, недапушчальна павольных тэмпаў разгортваньня важнейшых мерапрыемстваў па падрыхтоўцы да вясны. Масавая работа, якая дазволіла-б сапраўды мабілізаваць масы калгаснікаў і аднаасобнікаў — беднякоў і сераднякоў на барацьбу з куланом, на барацьбу з апартуністычным самацёкам і скажэньнямі дырэктыў партыі—гэта асноўная ўмова пасьпяховага ажыцьцяўленьня праграмы другой бальшавіцкай вясны ўсё-яшчэ недаацэньваецца. Толькі адсутнасьцю работы па мабілізацыі мас на выкананьне задач трэцяга рашаючага году пяцігодкі, адсутнасьцю масавага кантролю над ажыцьцяўленьнем важнейшых дырэктыў партыі і ўраду— можна вытлумачыць таптанье на месцы ў галіне падрыхтоўкі да надыходзячай пасеўнай кампаніі, зусім нездавальняючае разгортваньне калектывізацыі.

Трэба сказаць, што імкнена апартуністычная недаацэнка масавай работы ў ажыцьцяўленьні грандыёзных плянаў у бальшавіцкай пасеўнай, недаацэнка мабілізацыі мас на рашучае выкарчоўваньне капіталістычных элемэнтаў, недаацэнка неабходнасьці весьці самую бязьлітасную барацьбу на два фронты і асабліва з правым апартунізмам—пагражаюць зрывам плянаў бальшавіцкай сяўбы ў трэцім рашаючым годзе пяцігодкі.

ЦК у сваёй пастанове вызначыў рад важнейшых мерапрыемстваў па разгортваньні сапраўды ўдарных тэмпаў падрыхтоўкі. ЦК пастанавіў правесьці дэкаду праверкі работы па падрыхтоўцы да сяўбы, якая павінна быць праведзена агітмасавым аддзелам ЦК, НКЗ і «Зьвяздой». Дэкада будзе праведзена з 23 лютага да 5 сакавіка. Дэкада праверкі, абвешчаная ЦК КП(б)Б, аб'ядняецца з усесаюзнай праверкай друкам падрыхтоўкі да сяўбы, якая адбудзецца з 1 да 4 сакавіка.

Асноўнай задачай дэкады праверкі зьяўляецца ператварэньне яе ў сапраўды масавы агляд работы па падрыхтоўцы да другой бальшавіцкай вясны. Дэкада павінна зьявіцца адным са зьвеньняў барацьбы за другую калгасную вясну на аснове далейшага разгортваньня калгаснага руху. Яна павінна выклікаць рэзкі пералом ва ўсёй падрыхтоўчай рабоце, пачынаючы зьнізу даверху.

Масавы агляд падрыхтоўкі да весьнавой пасеўнай кампаніі патрабуе вялікага размаху. Гэты размах можа быць забясьпечан толькі ў тым выпадку, калі ў ім прымуць непасрэдны ўдзел самыя шырокія масы працоўных. Праверка павінна выявіць нашы слабыя вучасткі, ускрыць прычыны прарываў і адставаньня, паказаць узоры прыкладнай работы паасобных раёнаў, калгасаў, саўгасаў, вёсак, дапамагаючы ў ліквідацыі прарываў, мабілізаваць масы на яшчэ больш хуткае ажыцьцяўленьне задач сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на паказ ударнай падрыхтоўкі да сяўбы, каб адстаючыя раёны, саўгасы, калгасы і вёскі маглі-б вучыцца на узорных прыкладах.

Дэкада праверкі павінна прайсьці пад знакам узмацненьня барацьбы за генэральную лінію партыі, пад знакам праверкі таго, як усе арганізацыі на практыцы ажыцьцяўляюць гэту лінію. Трэба выявіць усе факты скажэньня генэральнай лініі партыі, кажэрэтных носьбітаў правага апартунізму на практыцы і бюракратаў, якія граюць на руку клясаваму ворагу.

На друку ляжыць адказьнейшая задача. Друк, у тым ліку і раённы, павінен арганізаваць, пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый, усебеларускі паход на дапамогу пасеўнай кампаніі. Друк, на аснове генэральнай лініі партыі, павінен дапамагчы партыйным, савецкім і іншым арганізацыям «стаць на чале новага ўздыму калгаснага руху мільённых мас вёскі і забясьпечыць тым самым рашаючыя посьпехі ў справе ліквідацыі кулацтва і сацыялістычнай перабудовы вёскі». Друк абавязан мабілізаваць і арганізаваць новыя масы працоўных на барацьбу за другую бальшавіцкую вясну. У сувязі з гэтым, вялізарную работу трэба разгарнуць сярод рабселькораў. Рабселькор павінен быць ня толькі сыгналізатарам тых ці іншых недахопаў, але і непасрэдным арганізатарам мас, байцом за выкананьне і перавыкананьне плянаў весьнавой сяўбы. Усе сельскоры вёсак, калгасаў і саўгасаў павінны быць пагалоўна ўцягнуты ў праверку, мабілізаваны на арганізацыю новага калгаснага прыпіву, у прыватнасьці, праз стварэньне ініцыятыўных груп з селькораў і чытачоў газэт.

Шырокае месца адводзіцца ў праверцы рабкорам. Рабкоры фабрык і заводаў павінны прасачыць за выкананьнем іх прадпрыемствамі заказаў сацыялістычнага зямляробства. На абавязку рабкораў транспарту — забясьпечыць своячасовае прасоўваньне пасеўных грузаў. Гарадзкія рабкоры павінны прыняць самы шырокі ўдзел у праверцы работы арганізацый, зьвязаных з сельскай гаспадаркай, і дапамагчы арганізаваць рабочыя масы на даламогу бальшавіцкай пасеўнай.

Для правядзеньня праверкі пры райкомах партыі павінны быць створаны раённыя штабы з удзелам прадстаўнікоў грамадзкасьці, якія кіруюць усёй работай па праверцы. Асноўным зьвяном пры правядзеньні праверкі зьяўляецца праверачная брагада ў сельсавеце, калгасе, саўгасе, вёсцы, на заводзе, на чыгуначным вузьле. Праверку трэба арганізаваць так, каб была забясьпечана арганізуючая і кіруючая роля нізавых партыйных ячэек і сельсаветаў з прыцягненьнем усёй рабселькораўскай армеі і самых шырокіх мас мясцовай грамадзкасьці, груп беднаты, калгаснікаў, саўгаснікаў і актывістаў - аднаасобнікаў.

«Зьвязда» зварачаецца да ўсіх партыйных, камсамольскіх, прафсаюзных, грамадзкіх арганізацый і друку неадкладна ўключыцца ў праверку, якая павінна зьявіцца адным з важнейшых мерапрыемстваў па забясьпечаньні посьпеху другой бальшавіцкай вясны і арганізацыі новага магутнага прыпіву ў калгасы.

Уступная прамова тав. ЧАРВЯКОВА

Прыяд ад IX да X Усебеларускага зьезду саветаў зьяўляўся пераломным для Савецкага Саюзу, а ў тым ліку і для Савецкай Беларусі, як неразрыўнай яго часткі, а таксама і для капіталістычнага сьвету.

Для савецкіх рэспублік гэты пералом адзначаўся ўступленьнем у прыяд сацыялізму з гіганцкім разгортваньнем сацыялістычнага будаўніцтва. У капіталістычных краінах гэты пералом адзначаўся ўсё паглыбляючымся рэзкім эканамічным упадкам.

Выконваючы пастановы IX Усебеларускага зьезду саветаў на аснове генэральнай лініі партыі, рабочая кляса БССР пад кіраўніцтвам КП(б)Б, вядучы ўсіх працоўных па шляху пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва, дабілася надзвычайна вялізарных посьпехаў у справе сацыялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі. Яна дамаглася выкананьня і перавыкананьня праграмы першых двух гадоў пяцігодкі, разучага паваротy да сацыялізму мільённых серадняцкіх мас, стварыўшы магчымасьць перайсьці ад лёзунгу абмежаваньня і выцісканьня кулацтва да ліквідацыі яго, як кляслы, на базе суцэльнай калектывізацыі, яшчэ цясьнейшым стала інтэрнацыянальнае аб'яднаньне працоўных усіх нацыянальнасьцяй у БССР, а таксама аб'яднаньне працоўных БССР з працоўнымі саюзных рэспублік для барацьбы за сацыялізм.

Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі савецкі ўрад БССР, пры сталай дапамозе з боку Саюзнага ўраду, забясьпечыў магутны размах сацыялістычнай індустрыялізацыі, які суправаджаўся вялізарнейшым уздымам вытворчага энтузіязму рабочых мас, стварыў моцную базу для выкананьня пяцігодкі за чатыры гады.

Посьпехі Савецкай Беларусі ў галіне разгортваньня сацыялістычнай прамысловасьці характарызуюцца тым, што на працягу апошняга году валавая продукцыя БССР перавысіла даваенны ўзровень больш чым у тры разы, і больш, чым у два разы ўзровень 1927-28 году.

Вялізарныя посьпехі індустрыялізацыі і сельскай гаспадаркі, пралетарыят, пістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі; колькасьць саўгасаў, іх зямельная плошча і ўдзельная вага ў валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі за апошнія гады значна ўзрасла. Калгасная пяцігодка перавыкананa ўжо ў бягучым гаспадарчым годзе. Наперакор панікёрскім заявам правых апартуністаў аб дэградацыі сельскай гаспадаркі, рабочая кляса, пад кіраўніцтвам кампартыі, на базе кіруючай ролі сацыялістычнай прамысловасьці, аб'ядкаючы раздробленыя аднаасобныя сялянскія бядняцка-серадняцкія гаспадарні ў калгасы, забясьпечыла магчымасьць пасьпяховага вырашэньня АСНОЎНЫХ СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧЫХ ПРАБЛЕМ. Зернавая праблема ў Савецкім Саюзе з посьпехам вырашана. У сучасны момант краіна Саветаў разгортвае вялізарную работу па вырашэньні жывёлагадоўчай праблемы, што ўскладае на Савецкую Беларусь асаблівыя адказныя задачы.

Побач з вырашэньнем важнейшых гаспадарчых задач у галіне прамысловасьці і сельскай гаспадаркі, пралетарыят калгаснікі і бядняцка-серадняцкія масы Савецкай Беларусі намагалі ўсе свае сілы для ўздыму культурнага ўзроўню гораду і вёскі для вырашэньня задач будаўніцтва культуры, пралетарскай на зьмесьце і нацыянальнай па форме.

Увядзеньне ўсеагульнага навучаньня, арганізацыя работы па завяршэньні ліквідацыі няпісьменнасьці сярод дарослых у 1931-32 годзе, вялікая работа ў галіне прафтэхнічнага навучаньня, шырокае разгортваньне вышэйшых навучальных устаноў, якія запаўняюць студэнты з рабочых, батракоў, калгаснікаў і бядняцка-серадняцкіх мас сялянства, для падрыхтоўкі новых пралетарскіх кадраў па ўсіх галінах народнай гаспадаркі, — вось яскравыя прыклады, якія характарызуюць посьпехі Савецкай Беларусі за апошні час у галіне культурнага будаўніцтва.

Гігантскія тэмпы індустрыялізацыі краіны значна павялічылі колькасьць рабочых на вытворчасьці, забясьпечылі ўзьнікьнае матар'яльнага і культурнага ўзроўню рабочых шляхам павышэньня рэальнай заработнай платы, пераходу на сямігадзінны рабочы дзень, увядзеньня пяцідзённага бесьперапыннага тыдня, ліквідацыі ў асноўным беспрацоўя. Усе гэтыя посьпехі Савецкай Беларусі дасягнуты таму, што пад кіраўніцтвам кампартыі рабочая кляса, апіраючыся на калгаснікаў і бядняцкія масы вёскі, у саюзе з серадняком, рашуча змагалася за ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі, накіраванай на зьнішчэньне рэштак эканамічнай і культурнай няроўнасьці, на ўзмацненьне інтэрнацыянальнай сувязі ўсіх працоўных для рашучай барацьбы за перамогу сацыялізму.

КП(б)Б забясьпечыла ўдзел шырокіх рабочых мас у непасрэдным ажыцьцяўленьні беларусізацыі дзяржаўнага, гаспадарчага, каапэрацыйнага і прафэсыянальнага апаратаў, у вывучэньні гісторыі, эканомікі Беларусі і г. д. Усё гэта садзейнічала ўзмацненьню кіруючай ролі рабочае клясы ў справе ўтварэньня беларускай культуры, нацыянальнай па форме і пралетарскай па зьмесьце.

Важнейшае месца ў вырашэньні нацыянальнай палітыкі займалі ў жыцьці Савецкай Беларусі пытаньні абслугоўваньня нацменшасьцяй. Каб зьнішчыць нацыянальную замкнутасьць і абмежаванасьць, каб замацаваць інтэрнацыянальную салідарнасьць працоўных усіх нацыянальнасьцяй для агульнай барацьбы за перамогу сацыялізму, камуністычная партыя і ўрад Савецкай Беларусі ўвесь час клапаціліся аб паляпшэньні матар'яльнага і культурнага становішча нацменшасьцяй, мабілізавалі рабочыя, батрацка-бядняцкія і серадняцкія масы вёскі для рашучай барацьбы з вялікадзяржаўным шавінізмам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, з контр-рэвалюцыйным беларускім нацдэмакратызмам і шавінізмамі іншых колераў.

Пад кіраўніцтвам партыі і ўраду рабочая кляса і працоўныя Савецкай Беларусі з посьпехам перамагаюць усе цяжкасьці, якія сустракаюцца на шляху сацыялістычнага будаўніцтва, добра ведаючы, што асноўнымі ўмовамі пасьпяховай і хутчэйшай перамогі гэтых цяжкасьцяй зьяўляецца ўзмацненьне тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, разгортваньне наступленьня на капіталістычныя элемэнты па ўсім фронце.

Посьпехі ў справе індустрыялізацыі краіны і калектывізацыі сельскай гаспадаркі пашырылі сацыяльную базу апоры партыі і савецкай улады на вёсцы ў асобе калгаснікаў.

Ажыцьцяўляецца задача, пастаўленая Ўладзімерам Ільічом Леніным аб ператварэньні Расіі з напамнаўскай у Расію сацыялістычную. Ліквідацыя кулацтва як класы на базе суцэльнай калектывізацыі мае вялізарнае значэньне і азначае «штурм рабочае клясы на апошнюю апору капіталістычнай эксплёватацыі краіны».

Гэтыя посьпехі рабочае клясы і ўсіх працоўных у справе будаўніцтва сацыялізму ў прамысловасьці і сельскай гаспадарцы былі магчымы толькі на базе вялізарнай актыўнасьці рабочае клясы і працоўных мас, якія ідуць за ёй, што суправаджалася шырокім разгортваньнем сацспаборніцтва, ударніцтва і рашучай перабудовы работы ўсіх органаў пралетарскай дыктатуры ў адпаведнасьці з задачамі рэканструкцыйнага пэрыяду, пад лёзунгам мабілізацыі мас за бальшавіцкія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва, за перамогу цяжкасьцяй, за рашучы паварот усіх пралетарскіх арганізацый да вытворчасьці, да калгаснага будаўніцтва.

Пасьпяховае разгортваньне сацыялістычнага будаўніцтва Савецкай Беларусі выклікае жорстокае супраціўленьне з боку аджываючых кляс. У сувязі з гэтым сацыялістычнае будаўніцтва Савецкай Беларусі адбываецца ва ўмовах надзвычайна абвостранай клясавай барацьбы. Гэтая барацьба паглыбляецца яшчэ і тым, што ў БССР, як у прымежнай рэспубліцы, у больш рэзкай форме назіраецца ўзаемадзяйнічаньне контр-рэвалюцыйных сіл унутры БССР з тымі варожымі сіламі ў буржуазных краінах, якія вядуць падрыхтоўку да ваеннага нападу на Савецкі Саюз.

Капіталістычны сьвет перажывае ў сучасны момант надзвычайна глыбокі эканамічны крызіс. Гэты крызіс разьбівае тэорыі сацыял-дэмакратаў аб «арганізаваным капіталізьме», тэорыю, якая абаранялася правымі ўхілістамі. Гэты крызіс, перарастаючы ў палітычны, узьнімае новую хвалю рэвалюцыйнага руху ў капіталістычных краінах. Разам з абвастрэньнем усіх супярэчнасьцяй у імпэрыялістычнай сыстэме, усё больш абвастраюцца супярэчнасьці паміж Савецкім Саюзам і капіталістычным сьветам. Нянавісьць сусьветнай буржуазіі да першай у сьвеце дзяржавы дыктатуры пралетарыяту — бацькаўшчыны сусьветнага пралетарыяту — выяўляецца ў шалёнай хлусьлівай кампаніі буржуазіі аб прымусовай працы ў СССР, аб дэмпінгу і накіравана на арганізацыю эканамічнай блёкады і падрыхтоўкі вайны супроць Савецкага Саюзу.

Спробы міжнародных буржуазіі справаваць Савецкі Саюз на вайну праз Усходня-Кітайскую авантуру сустрэлі руйнуючы адпор.

Наша слаўная Чырвоная армія прадэманстравала перад усім сьветам, што яна захавала сваю баявую моц і цьвёрда стаіць на варце савецкіх межаў.

У барацьбе супроць Савецкага Саюзу імпэрыялісты імкнуцца абаперціся на контр-рэвалюцыйныя элемэнты ўнутры нашае краіны. Гэта сувязь контр-рэвалюцыйных кулацка-нэпманаўскіх элемэнтаў унутры Савецкай Беларусі з інтэрвэнцыянісцкімі групамі буржуазных дзяржаў найбольш яскрава выяўлена пры раскрыцьці дзейнасьці контр-рэвалюцыйнай групы беларускіх нацыянал-дэмакратаў.

Беларускія нацыянал-дэмакраты ў гады Кастрычніцкай рэвалюцыі — як агенты буржуазіі, абшарнікаў і кулакоў — праводзілі адкрытую барацьбу з паўстаўшым пралетарыятам Савецкай Беларусі. Яны імкнуліся да стварэньня буржуазнай беларускай народнай рэспублікі ў саюзе з польскім фашызмам. Перомажнае разгортваньне Кастрычніцкай рэвалюцыі прымусіла да разгрому контр-рэвалюцыйнай арганізацыі беларускіх нацыянал-дэмакратаў, зьлікідаваўшы іх дзейнасьць на тэрыторыі БССР.

Клясавая сутнасьць контр-рэвалюцыйнай беларускай нацыянал-дэмакратычнай групы, яна ставіла стаўку на кулака, нэпмана, выступаючы з лёзунгам «адраджэньня» буржуазнай Беларусі, заключаецца ў барацьбе за аднаўленьне капіталізму ў нашай краіне, за ператварэньне Беларусі Савецкай — у Беларусь буржуазна-капіталістычную, фашысцкую.

Выкрыцьцё гэтай контр-рэвалюцыйнай групы і яе дзейнасьці выклікала надзвычайнае абурэньне самых шырокіх мас рабочых, батрацтва, беднаты, калгаснікаў і ўсіх працоўных, якія яшчэ больш згуртаваліся вакол кампартыі для барацьбы за абарону сваёй пралетарскай бацькаўшчыны, для выкананьня задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Накіроўваючы галоўны агонь супроць вялікадзяржаўнага шавінізму, рабочая кляса, пад кіраўніцтвам партыі, вядзе бязьлітасную барацьбу з рэшткамі беларускага контр-рэвалюцыйнага нацыянал-дэмакратызму і шавінізмамі іншых колераў.

У змаганьні за няўхільнае ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, КП(б)Б і пад яе кіраўніцтвам рабочая кляса, разьбіўшы ў свой час контр-рэвалюцыйны трацкізм, вядуць бязьлітасную барацьбу супроць галоўнай небясьпекі на даным этапе — правага апартунізму, кулацкай агентуры ў радах партыі, супроць права-лявацкага ўхілу і прымірэнцтва да ўхілаў.

Правы правага ўхілу ў КП(б)Б цесна перапляталіся з ухіламі ў бок нацыянал-апартунізму. Нацыянал-апартунізм зьяўляецца агентурай нацыянал-дэмакратаў у радах камуністычнай партыі. КП(б)Б мабілізавала ўсю партыйную арганізацыю, рабочую клясу і ўсіх працоўных на рашучую барацьбу супроць праяў нацыянал-апартунізму, выходзячы з таго, што погляды нацыянал-апартунізму не сумяшчальны з прабываньнем у радах камуністычнай партыі.

У сучасны прыяд Савецкая Беларусь разам з усім Савецкім Саюзам уступіла ў трэці год пяцігодкі — рашаючы год у справе выкананьня пяцігодкі за чатыры гады. Выкананьне задач трэцяга году пяцігодкі забясьпечвае завяршэньне пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі ў Савецкім Саюзе.

У адказ на контр-рэвалюцыйную дзейнасьць клясавых ворагаў, у адказ на імкненьні міжнародняй буржуазіі арганізаваць інтэрвэнцыю супроць Савецкага Саюзу і сарваць выкананьне нашай пяцігодкі, рабочая кляса і ўсе працоўныя Савецкай Беларусі павінны яшчэ больш мабілізаваць працоўныя масы пад кіраўніцтвам партыі для таго, каб саветы Беларусі былі сапраўднымі барацьбітамі за генэральную лінію партыі, за выкананьне пяцігодкі за чатыры гады, за завяршэньне пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі ў нашай краіне, за ўзмацненьне абароназдольнасьці краіны і баяздольнасьці Чырвонай армеі, за баявыя бальшавіцкія тэмпы ў рабоце.

Няхай жыве Савецкі Саюз!

Няхай жыве камуністычная партыя і яе ленінскі ЦК!

Няхай жыве Х Усебеларускі зьезд саветаў!

ЦВК і СНК СССР

Х-ты Ўсебеларускі зьезд саветаў ад імя працоўных Беларускай ССР горача вітае Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Саюзу ССР.

Працоўныя Беларускай ССР за час, які прайшоў з IX Усебеларускага Зьезду Саветаў, пры дапамозе і падтрыманьні Савецкага Саюзу і пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, у жорсткай барацьбе з клясавым ворагам і яго агентурай — правымі і «левымі» апартуністамі і нацыянал-апартуністамі, у барацьбе за генэральную лінію ленінскай партыі, атрымалі рад новых буйных перамог у галіне сацыялістычнага будаўніцтва, пасьпяхова ажыцьцяўляючы лёзунг партыі і рабочых мас «Пяцігодка — за чатыры гады», і разам з працоўнымі ўсяго Саюзу ўступілі ў прыяд сацыялізму.

Разгортваючы шырокае сацыялістычнае наступленьне на капіталістычныя элемэнты краіны, ліквідуючы кулацтва, як клясу, на базе суцэльнай калектывізацыі — працоўныя масы Беларускай ССР, пераможна завяршыўшы першыя два гады пяцігодкі, вядуць з вялізарнейшым энтузіязмам напружаную работу па ажыцьцяўленьні задач трэцяга рашаючага году пяцігодкі — году завяршэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі.

Знаходзячыся на чале ўзрастаючай рэвалюцыйнай ініцыятывы і творчай актыўнасьці рабочае клясы, калгаснікаў, а таксама бядняцка-серадняцкіх мас вёскі, савецкая ўлада Беларусі, пад кіраўніцтвам партыі бальшавікоў і яе ЦК, вядучы бязьлітасную барацьбу з вялікадзяржаўным расійскім шавінізмам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, з мясцовымі шавінізмамі і ў першую галаву — з беларускім контр-рэвалюцыйным нацыянал-дэмакратызмам, — будуе беларускую пралетарскую культуру, нацыянальную па форме і сацыялістычную па сваім зьмесьце, узмацняючы БССР — апору Савецкага Саюзу на рубяжы з імпэрыялістычным сьветам.

Ва ўзмацненьні сувязі савецкіх рэспублік — зарука далейшых перамог.

Няхай жыве Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

Старшыня Х-га Ўсебеларускага Зьезду Саветаў А. ЧАРВЯКОЎ.
Сакратар Х-га Ўсебеларускага Зьезду Саветаў А. ХАЦКЕВІЧ.

Стройнымі радамі, сумесна з усім Саюзам ССР, наперад, да новых перамог

МАСКВА. Прэзыдыум ЦВК СССР вітае Х Усебеларускі зьезд саветаў, які заклікан вырашыць гістарычную задачу па забясьпячэньні выкананьня пяцігодкі за чатыры гады на тэрыторыі БССР і пераможнага завяршэньня яе трэцяга рашаючага году. Упэўнены ўдзельнікамі зьезду БССР зьяўляюцца ўдарнікі сацыялістычнага будаўніцтва—рабочыя і калгаснікі, што маюць вопыт упартай рэвалюцыйнай работы па калектывізацыі сельскай гаспадаркі, па правядзеньні неабходнымі тэмпамі сацыялістычнай рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі, што служыць заручкай пасьпяховай работы зьезду. Прэзыдыум ЦВК Саюзу ССР выражае цьвёрдую упэўненасьць, што працоўныя масы БССР усіх нацыянальнасьцяй, як і ў першыя два гады пяцігодкі, змогуць перамагчы ўсе труднасьці, выкрыць і выгнаць з савецкіх органаў апартуністаў і контр-рэвалюцыйных шавіністаў, стройнымі радамі пойдуць сумесна з усім Саюзам ССР па шляху далейшага разгорнутага сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце.

Старшыня ЦВК Саюзу ССР КАЛІНІН.
Сакратар ЦВК Саюзу ССР ЕНУКІДЗЭ.

З залі пасяджэньня

— Бесьперапынна прыбываюць дэлегаты. Прасторная „заля «Культуры» цалкам запаўняецца. Апошняя падрыхтоўка кіно - апэратараў.

—)—(—

— Да стала прэзыдыуму ідуць т. т. Чарвякоў і Хацкевіч. Старшыня ЦВК абвяшчае:

—)—(—

— На зьезд зьявілася 610 дэлегатаў з рашаючым і 164—з дарадчым голасам. Паводле канстытуцыі БССР, трэба пічыць Х-ты Ўсебеларускі зьезд саветаў правамоцным...

— ТОЛЬКІ Ў ВЫНІКУ НЯЎХІЛЬНАГА ПРАВЯДЗЕНЬНЯ ЛЕНІНСКАЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЕ ПАЛІТЫКІ, — гаворыць ва ўступнай прамове тав. ЧАРВЯКОЎ, — САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ ДАБІЛАСЯ ТЫХ ВЯЛІЗАРНЫХ ПОСЬПЕХАЎ, З ЯКІМІ ЯНА ПРЫХОДЗІЦЬ ДА Х-га ЗЬЕЗДУ САВЕТАЎ.

—)—(—

— Тав. ХАЦКЕВІЧ ад імя камуністычнае фракцыі зьезду прапануе абраць Прэзыдыум у складзе 61 чалавек, сакратарыят — з 20 чалавек і мандатную камісію з 21 чалавек. Замытаецца сьпіс кандыдатур. Презьвішчы т. т. Гея Галадзеда суправаджаюцца дружнымі воплескамі.

—)—(—

— Пад гучныя воплескі абіраецца ганаровы прэзыдыум зьезду. У ганаровым прэзыдыуме — палітбюро ЦК УсеКП(б) і тав. Андрэеў.

Зьезд зацьвярджае парадак дня.

—)—(—

— З вялікай прывітальнай прамовай выступае сакратар ЦК КП(б)Б К. В. ГЕЙ.

—)—(—

— Аднагалосна ўхваляецца тэкст прывітальнай тэлеграмы ад імя зьезду —ЦК КП(б)Б і ЦК УсеКП(б). Тав. Хацкевіч чытае прывітаньне, ад ЦВК СССР.

—)—(—

— Вітаць наш зьезд,—абвяшчае тав. ЧАРВЯКОЎ, — зьявіліся дэлегаты чырвонасьцяжных менскіх прадпрыемстваў.

Адзін за адным, са сьцягамі, пад гукі маршу, узыходзяць на сцэну лепшыя ўдарнікі «Камунара», «Энергіі» «Бальшавіка», «Кастрычніка», «Драўнапрацоўшчыка».

—)—(—

— Гаворыць т. т. РАЙЦЫН, ШАРЭЙКА, КАЦ, ШАПАШНІКАЎ, САНАЛОЎ.

— На нашым заводзе «Энергіі»,—рапартуе т. Райцын,—у 1928 - 29 годзе было ўсяго 123 рабочых, з сяўета іх 1.350 чал. Ва ўдарным квартале 1930 г. мы на 150 проц. выканалі сваю праграму. У адказ на хлусьлівую знежнай буржуазіі аб «нявольніцкай працы» ў СССР мы прыкладзем усе намаганьні да таго, каб у трэцім рашаючым годзе пяцігодкі выйсьці з яшчэ лепшымі вынікамі.

—)—(—

— Слова для прывітаньня ад імя №-скай кавалерыйскай дывізіі мае тав. ШАТУНОЎ.

— Гаспадару Савецкай Беларусі, Х-му зьезду саветаў, гарачае чырвонаармейскае прывітаньне. Мотадамі сацспаборніцтва і ўдарніцтва бойцы №-й кав. дывізіі імя ангельскага пралетарыяту штурмуюць вышыні вучобы. Яны прымаюць актыўны ўдзел і ў агульным сацыялістычным будаўніцтве.

Мы пільна сочым за ворагам на Захадзе і, калі рука буржуазіі працягнецца за рубеж Савецкага Саюзу, мы гэту руку адсячом.

—)—(—

— Ад АБВШ зьезд вітае т. АСТАПЕНКА.

—)—(—

— Курсанты Аб'яднанай Беларускай Вайсковай Школы, узнагароджанай ордэнам ЧЫРВОНАГА СЬЦЯГУ, — будуць заўсёды ісьці ў першых радах барацьбітоў за сацыялістычнае будаўніцтва, за сусьветны Кастрычнік.

Заля сустракае і супроваджае байцоў авацыяй.

—)—(—

— Зьезд пасылае дэлегацыю для адказнага прывітаньня у АБВШ і кав. дывізію. У складзе дэлегацыі — т. т. АРАНШТАМ, ПАЛЯКОЎ, РЫЖОЎ, РАЧЫЦКІ і інш.

—)—(—

— Лыжная каманда вайсковых часьцей г. БЫХАВА, гаворыць тав. ГАЛЬЦЭВІЧ, якая прайшла адлегласьць у 250 кілёмэтраў за 31 гадзіну, горача вітае Х-ты зьезд.

— Наш стралковы полк, заўсёды ажыцьцяўляе лёзунг «тварам да матору». Зброя — у парадку, заўсёдная парушэньня дысцыпліны у нас няма. Мы заўжды гатовы!

—)—(—

— Ад заводу «Пралетарый», Усебеларускага настаўніцкага інстытуту, ударнікаў калгасу імя газэты «Калгаснік Беларусі» зьезд вітаюць т. Герман, Вольская і Чашанкоў.

—)—(—

З адказам на прывітаньні выступіў тав. Грыцевіч.

Ударны Н-скі стралковы рапартуе Х Усебеларускаму

1930 год для нашага палка, як і для ўсяе Чырвонае арміі, быў годам вялізарных посьпехаў у галіне павышэньня баяздольнасьці палка і ўзмацненьня абароназдольнасьці адзінай у сьвеце краіны Саветаў.

На падставе сацыялістычных адносін да працы — праз сацспаборніцтва і ўдарніцтва — мы змаглі паварнуцца тварам да тэхнікі, да матору. Мы змаглі паставіць полк на лыжы, пасьпяхова правесьці тэрытарыяльныя і агульныя зборы.

Усе гэтыя дасягненьні намі атрыманы дзякуючы няўхільнаму ажыцьцяўленьню генэральнай лініі нашай партыі, барацьбе на два фронты і бальшавіцкаму кіраўніцтву нашай палкавой партарганізацыі.

Мы ўступілі ў трэці рашаючы год пяцігодкі. Пагроза вайны, як ніколі, навісла над намі. Абяцаем Х Усебеларускаму зьезду саветаў, што, як і раней, з бальшавіцкай настойлівасьцю будзем змагацца за ўзмацненьне абароназдольнасьці нашай краіны і па-баявому выканаем задачы палка.

Чваб нам. палка КУЧКОЎ.
Чваб в. камісара палка СЯНКЕВІЧ.
Сакратар партколектыву ПЭЎЗНЭР.
Сакратар камсамольскага калектыву САКОЎСКІ.

У ДЗЕНЬ 25 ЛЮТАГА МАГУТНА І ЦЬВЁРДА БУДЗЕ ГУЧЭЦЬ ГОЛАС РАБОЧАЕ КЛЯСЫ ПОЛЬШЧЫ"

З АДОЗВЫ КАМПАРТЫІ ПОЛЬШЧЫ

БЭРЛІН, 18. Паводле паведамленьня з Варшавы, кампартыя Польшчы зьвярнулася з адозвай да ўсіх працоўных Польшчы ў сувязі з надыходзячым міжнародным днём барацьбы з беспрацоўем. У адозве гаворыцца, што афіцыйныя даныя аб беспрацоўі ў Польшчы — хлусьлівыя. САПРАЎДНАЯ ЛІЧБА БЕСПРАЦОЎЯ БОЛЬШАЯ ЗА МІЛЬЁН І ПАВЯЛІЧВАЕЦЦА ШТОДЗЕННА НА НОВЫЯ ТЫСЯЧЫ. Зьмяншэньне дапамогі, скарачэньне кольнасьці атрымліваемай дапамогі — вось якімі шляхамі капіталісты вядуць наступленьне на зарплату і ўмовы працы тых рабочых, што яшчэ працуюць. «Няма грошай для беспрацоўных, — гаворыцца далей у адозве, — але яны знаходзяцца для арміі, паліцыі і папсу. ЗНАХОДЗЯЦЦА МІЛЬЯРДЫ НА ПАДРЫХТОЎКУ ВАЙНЫ СУПРОЦЬ СССР. І таму ў дзень 25-га лютага магутна і цьвёрда будзе гучэць голас рабочай клясы Польшчы. «Руні прэч ад бацькаўшчыны ўсіх рабочых і сялян—СССР». «Грошы, якія прызначаны на падрыхтоўку вайны і белы тэрор, павінны быць разданы беспрацоўным».

Адозва заклікае працоўных Зах. Украіны і Зах. Беларусі да сумеснай з польскім пралетарыятам барацьбы за вызваленьне з-пад ярма польскага фашызму і за дапучэньне захопленых тэрыторый да Савецкай Украіны і Савецкай Беларусі.

Адозва таксама высоўвае рад канкрэтных патрабаваньняў беспрацоўных.

У заключэньне адозва заклікае польскіх працоўных адзначыць дзень барацьбы супроць беспрацоўя — 25-га лютага — масавымі дэманстрацыямі, галоднымі паходамі да бірж працы, магістратаў, ваяводстваў і г. д. пад лёзунгамі кампартыі.

У нядзелю, 22 лютага г. г. роўна ў 7 гадз. вечара у памяшканьні кіно „Чырвоная Зорка"

адбудзецца

прысьвечанае дню XIII-й гадавіны Чырвонай арміі

ўрачыстае пасяджэньне

пленуму Менскага гарадзкога савету

сумесна з членамі ЦК КП(б)Б,

МЫ УЗЯЛІ ВЫСОКІЯ ТЭМПЫ КУЛЬТУРНАГА БУДАЎНІЦТВА

ГЭТА АБАВЯЗВАЕ: партыйныя, савецкія і прафсаюзныя арганізацыі ўдзесяцярыць свой удзел на ўсіх франтох барацьбы за культуру, нацыянальную па форме і сацыялістычную па зьмесьце

НАЙБОЛЬШАЯ КЛЯСАВАЯ ПІЛЬНАСЬЦЬ—ЗАЛОГ НАШЫХ ПЕРАМОГ

Вынікі і пэрспэктывы культурнага будаўніцтва

З дакладу тав. Платуна

Таварышы, трэці год пяцігодкі зьяўляецца рашаючым годам для культурнага сацыялістычнага будаўніцтва.

Як мы ведаеце, мы ў гэтым годзе заканчваем ліквідацыю пісьменнасьці сярод дарослага насельніцтва ад 12 да 45 год. Мы з посьпехам разгортваем усеагульнае абавязковае навучаньне. Вялізарнейшыя тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва востра ставяць пытаньне падрыхтоўкі кадраў. У леташнім годзе мы мелі ва ўсіх нашых сярэдніх і вышэйшых навучальных установах каля 23 тыс. студэнтаў, а ў гэтым годзе мы маем ужо каля 45 тыс. Тэмпы надзвычай вялікія, небачаныя да гэтага часу.

У выніку гэтага на сёньняшні дзень мы на Беларусі маем. 13 вышэйшых навучальных устаноў.

Варта прывесьці некаторыя нарачаныя пяцігодкі культурнага будаўніцтва, якая была складзена раней з пяцігодкай, якая распрацавана ў 1930 г.

Паводле старой пяцігодкі на дашкольным навучаньні трэба было ахапіць 6,1 процанта дзяцей да канца пяцігодкі. Мы запраектавалі, пачынаючы з 1930 г. ахапіць ня менш 35 проц. На Усебеларускім зьезде саветаў, мы маркуем паставіць пытаньне, каб да канца пяцігодкі было ахоплена ня менш 55%. Запраектаваны былі 4 вышэйшыя навучальныя установы, а мы ўжо цяпер маем 13.

Навучальныя ўстановы павінны былі падрыхтаваць да канца пяцігодкі 4 з паловай тыс. чал., цяпер мы рыхтуем 13 тыс. чал.

8 тэхнікумаў, якія мы зараз маем на ўсіх гаспадарчых і культурных галінах, павінны былі рыхтаваць 4.800 чал., цяпер яны маюць і павінны мець да канца пяцігодкі 20 тыс. чал. Павялічэньне амаль у 5 раз.

Рабфакі павінны былі ахапіць 3.200 чал. Маем запраектавана 14 тыс. чал. і гэта ўжо ў 1931 г. ажыцьцяўляецца.

Чаму-ж былі ўзяты такія марудныя тэмпы? Справа ў тым, што наркамасьветы, у-прыватнасьці Баліцкі, Некрашэвіч сьвядома імкнуліся затармозіць справу культурнага будаўніцтва. Вынікі гэтай падмаўчкай работы дзелі свае рэзультаты. Да прыкладу, у гэтым годзе, калі прыйшлося набіраць студэнтаў у вышэйшыя і сярэднія навучальныя установы, мы апынуліся перад фактам, што не хапіла каля 6 тыс. чал. падрыхтаваных да паступленьня. Нам прыйшлося набіраць рабочых, калгасьнікаў, батракоў на кароткa-тэрміновыя курсы, падрыхтаваць іх і дасылаць у вышэйшыя і сярэднія навучальныя установы.

Намячаўся плян усеагульнага навучаньня за 4 групы пачатковай школы кончыць у 32-33 г., а мы ў 1932 г. закончым увядзеньне усеагульнага навучаньня не па першапачатковай школе, а бадай у разьмерны сямігодкі.

Таксама, таварышы, і з ліквідацыяй пісьменнасьці. Ліквідацыю пісьменнасьці памячалася закончыць у 1932-33 г., а мы у асноўным скончым у гэтым годзе.

Побач са значным павялічэньнем выдаткаў на падручнікі, продукт аховы студэнтаў стыпэндыямі ўзрос да 70. Разам з гэтым павялічвецца сама стыпэндыя. Мы маркуем у 1931-32 г. давесьці стыпэндыю студэнтаў да ўзроўню заработку сярэдняга кваліфікаванага рабочага.

На бюджэце 1928 г. на 1 камплект школы выдаткоўвалася 800 руб., у 1929-30 г. 1.064 руб., у гэтым годзе прадугледжана 1.300 руб. Апрача гэтага ў гэтым годзе ў зьвязку з павялічэньнем школы маркуецца на кожны раён асигнаваць на 3 з паловай тыс. для арганізацыі рабочых майстэрань і рабочых пакояў.

Значна палепшылася і матар'яльнае становішча культурна - асьветных работнікаў.

У гэтым годзе агульнае павялічэньне заработнай платы павінна было быць для працоўных каля 8 проц., а настаўнікам павялічана заработная плата на 20 з лішнім процантаў. Ужо сёлета настаўнікі атрымліваюць 68 руб. пенсіі—амаль выкананы праект пяцігодкі.

КУЛЬТУРНАЕ БУДАЎНІЦТВА—СПРАВА ЎСІХ ПРАЦОЎНЫХ

Я быў надоечы на раённым зьезьдзе саветаў у Быхаве. На ім быў цэлы рад работнікаў Наркамасьветы і інш. З дакладамі выступала шмат людзей і трэцяя частка спрэчак і гутарак на зьезьдзе была прысьвечана культурнай рэвалюцыі, дадатнім і адмоўным моментам у справе культурнага будаўніцтва. Гэта гаворыць аб тым, што справай культурнага будаўніцтва цікавяцца шырокія колы працоўных.

Мы маем зараз агульны ўздым грамадзкасьці ў паходзе за культуру. Сёлета мы мелі характэрны прыклад гэтага ўздыму: усеагульны суботнік на карысьць усеагульнага навучаньня і палітэхнізацыі школы. Гэта факт вялікага ня толькі матар'яльнага але і палітычнага значэньня.

Вельмі многа дапамагла ўцягненьню грамадзкасьці ў нашу работу праведзеная культурная эстафэта і пракат яе —«дакада штурму».

Нельга сказаць, што гэта праходзіла добра ва ўсіх раёнах. Але ў большасьці іх мы дасягнулі свае мэты. Працоўныя масы зацікавіліся гэтай справай, удзиглуліся ў культурнае будаўніцтва.

Трэба лічыць, што культэстафэта і «дакада штурму» — гэта толькі пачатак, што за імі будзе далейшы ўздым да культурнага будаўніцтва з боку працоўных як гораду, так і вёскі.

Пераходзячы да якасьці работы, я прымушаны адзначыць, што сыстэма народнай асьветы ў БССР зараз выраслася. Гэтае пытаньне абгаварвалася з 1919 году. Іспавалі ,як відома, дзьве плыні: адны выказваліся за славесную школу і была плынь украінская—якая выказвалася за прафэтэхнічную школу.

Зараз усесаюзная партыйная нарада зацьвердзіла такую сыстэму народнай асьветы: дзіцячыя сады, ачаг, палітэхнічныя сямігадовыя школы з першым і другім канцэнтрам, ФЗВ і тэхнікумы.

БОЛЬШ НАПОРНАСЬЦІ Ў ПЕРАБУДОВЕ ШКОЛ

У нас на Беларусі засталося яшчэ некалькі школ прафсыпшальна - тэхнічных, з тае прычыны, што па ўсіх галінах народнай гаспадаркі і прамысловасьці мы ня можам адразу-ж арганізаваць фабзавуч.

Надзвычай вялікі зрух у пытаньні падрыхтоўкі кадраў ставраецца дзякуючы рэарганізацыі вышэйшай і сярэдняй школы. У 1929-30 годзе мы рэарганізавалі нашу вышэйшую школу, па-першае, надаўшы ёй напрамак вузкай спэцыялізацыі, і, па-другое, скарацілі тэрмін навучаньня і ўшчыльнілі навучальны год.

Раней у вышэйшых навучальных установах фармальна налічвалася 10 ме сяцаў навучальнага году, а фактычна вучыліся максымум 6—5 месяцаў і такім чынам расьцягнутасьць курсу даходзіла да 4-х—5 год. Мы ўзялі зараз такі напрамак, каб усе вышэйшыя школы, згодна пастановы ЦК УсеКП(б), курс навучаньня скарацілі-б да 4-х год. ушчыльнілі навучальны год да 10 месяцаў. Важнейшым мерапрыемствам зьяўляецца тое, што вышэйшыя і сярэдня ўстановы пераведзены на 75 проц. па актыўны мэтад выкладаньня на лябараторныя заняткі. Усё гэта значна ўзьнімае якасьць выпускнікоў.

Велічэньня важнасьці студэнцкай практыкі бясспрэчна, тым больш важна падкрэсьліць аб шкадзе не якасьці. Многія студэнты тэхнічна - навучальных устаноў, ня кажучы ўжо аб эканамічных і педагагічных установах, скарджацца на тое, што выварчая практыка так паставлена, што яны часта нічога не даю. Трэба павесьці рашучую барацьбу з тэй коснасьцю, якая ёсьць у нас у асобных гаспадарчых і савецкіх установах у адносінах да практыкантаў-студэнтаў. У Менску мелі месца такія факты, калі практыканту заяўлялі: «мы будзем плаціць табе грошы і не перашкаджай працаваць». Такім чынам, народ хадзіў, нічога не рабіў, атрымліваў грошы і больш нічога.

У мінулым годзе ў нас адбылася перадача гаспадарчых арганізацый ВНУ і тэхнікумам на адпаведныя спэцыяльнасьці. Трэба адзначыць, што ў нас з падрыхтоўкай кадраў для прамысловасьці было зусім ненармальнае становішча. Улічваючы гэта ЦК партыі прапанаваў перадаць адпаведныя навучальныя ўстановы прамысловасьці. Гэта мы праводзім, і ў выніку маем значныя посьпехі ў рабоце адпаведных навучальных устаноў.

Пытаньне, на якім таварышы асабліва спыняліся дуг—гэта палітэхнізацыя школ, а таксама падручнікі і праграмы.

Усебеларускі зьезд па палітэхнізацыі даў некаторыя наказаньні агульнага і практычнага парадку аб палітэхнізацыі нашай школы. Што мы маем зараз? Трэба сказаць, што ёсьць шмат дадатных вынікаў за той невялікі час, які прайшоў пасьля усебеларускага зьезду па палітэхнізацыі. Узяць хаця-б выстаўку ў Менску ў Доме Асьветы. Яна паказвае, што школы займаюцца палітэхнізацыяй, што яны сёе-тое робяць. Але шмат яшчэ недароблена таго, што магчыма было-б зрабіць у яўных умовах.

Да гэтага часу яшчэ існуюць разважаньні, што раз няма буйных прадпрыемстваў, электрастанцый, мэханізаваных і мэханізаваных сельскай гаспадарцы, дык ня можа быць палітэхнізацыі. Некаторыя таварышы асабліва настойліва патрабуюць спэцыяльных майстэрань. Шмат якія настаўнікі лічаць, што лепш і лягчэй працаваць па-старыцы. З такімі настроямі мы павінны змагацца пры рэарганізацыі нашай школы. Нам патрэбны новы мэтад, плянавая работа.

Настаўнікі павінны больш вывучаць і прапрацоўваць падручнікі, якія ёсьць, хоць і цяжка ўвязаць і х з элементамі палітэхнізацыі школы.

Шмат якія таварышы лічаць да гэтага часу, што палітэхнізм—гэта асобны прадмет, правядзеньне якога павінна адбывацца ў нейкіх надзвычайных майстэрнях. Мы-ж павінны будаваць палітэхнізм на базе саўгасаў і калгасаў, павінны шляхам экскурсій і тлумачэньняў прымусіць вучняў аўладаць практычнымі ведамі. Наконт падручнікаў і праграм.

Загана Наркамасьветы ў тым, што мы спазьніліся з выданьнем падручнікаў у мінулым годзе і спозьнімся сёлета. Наш апарат працаваў марудным тэмпам, ня так, як трэба, працавала і Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва.

Раней у нас было некалькі аўтараў-манапалістых, якія пісалі падручнікі. Нацыянал - дэмакраты імкнуліся расшаўсюдзіць свае школы ўплыў праз падручнікі.

Граматыка Лёсіка, геаграфія М. Грамыкі, дэманстар С. Некрашэвіча,—ва ўсіх гэтых кніжках старанна абыходзілася сацыялістычнае будаўніцтва, рабочая клясе. А калі ўзяць тыя начатковыя школы, якія выкладалі наводзе гэтых кніжок, дык атрымаюцца вельмі сумныя лічбы. Пачатковых школ у нас 18.000, значыцца 13.000 настаўнікаў выкладалі па гэтых кніжках.

Я гавару ўсё гэта для таго, каб таварышы з большай клясавай чуласьцю падыходзілі да гэтых пытаньняў.

Нам трэба самім узяцца за пісаньне падручнікаў. У кожным з нашых новых падручнікаў могуць быць намыкі. Мы павінны паказваць на іх і хутчэй выпраўляць.

РАБОТУ КУЛЬТУСТАНОЎ—ПАД ГРАМАДЗКІ КАНТРОЛЬ

Работа Наркамасьветы — ня толькі ў школах. Ёсьць яшчэ масавая палітасьветная работа якая, дарэчы настаўлена вельмі дрэнна. Нашы хаты-чытальні на 60 проц. над замком; хатнікі скарыстоўваюцца на ўсякай, але толькі не на непасрэдная работе.

У нас значна вырасьлі запатрабаваньні ў выдавецкай прадукцыі. Прадукцыя нашых пісьменьнікаў за апошнія гады вельмі ўзьнялася па сваёй якасьці, але ўсё-ж яна незадаволі такая, як патрэбна. Возьмем такую справу, як стварэньне тэатральнага рэпэртуару. На Беларусі няма п'ес. У нас ёсьць больш 100 арганізаваных пісьменьнікаў, але п'ес няма. Колькі мы ня імкнуліся зьвязацца з пісьменьнікамі, колькі не выклікалі іх — нічога не атрымліваецца.

П'есу «Міжбур'е» напісаў вайсковы таварыш, а «Гуту»,—лепшую п'есу гэтага сезону — прафработнік, школр. Пісьменьнікі нічога не далі. Янка Купала даў насквіль супроць савецкай улады, а цэлы рад п'ес, якія нельга ставіць («Вір», «Каля тэрасы») мы сёлета ўжо зьнялі з рэпэртуару.

Дагэтуль яшчэ не праведзена выстарчальная клясавая дыфэрэнцыяцыя сярод пісьменьнікаў.

Да гэтага часу ў нашых раёнах таварышы ня ведаюць нават аб тым, якія сродкі ў нас выкарыстоўваюцца на культурнае будаўніцтва. Нам трэба дамагчыся таго, каб усе сродкі, якія адпускаюцца на культурнае будаўніцтва, абавязкова выкарыстоўваліся на непасрэдным сваім прызначэньні.

Трэба, каб працоўная грамадзкасьць яшчэ больш чым дагэтуль увайшла ва ўсе пытаньні культурнага будаўніцтва. Для гэтага настаўнікам у першую чаргу трэба падыйсьці да працоўнай грамадзкасьці, трэба дабівацца, каб кожная школа была цэхам, якім будзе цікавіцца тое прадпрыемства, пры якім яна працуе.

Прафсаюзы і работа сярод настаўніцтва

Гаварыць аб задачах работы прафсаюзаў сярод настаўніцтва—гэта значыць, па-першае, сказаць аб задачах, якія пастаўлены камуністычная партыя перад прафсаюзамі, перад усім прафрухам у сучасны пэрыяд.

Мы ўступілі ў пэрыяд сацыялізму і завяршаем набудову фундаманту сацыялістычнай эканомікі. За апошні год у нашай краіне адбыліся вялікія сацыяльна-эканамічныя зрухі.

Мы практычна ажыцьцяўляем лёзунг ліквідацыі кулацтва як класы на базе суцэльнай калектывізацыі. Партыя і над яе кіраўніцтвам пралетарыят, у цеснай сувязі з асноўнымі масамі сялянства рашуча разгортваюць наступленьне сацыялізму на ўсім фронце.

Больш энэргіі ў правядзеньні ўсеагульнага абавязковага навучаньня

БССР першая з рэспублік Савецкага Саюзу ўвяла ўсеагульнае абавязковае навучаньне, дабіўшыся ў гэтай галіне значных посьпехаў. Дакументы і выступленьні кіруючых і кізавых работнікаў, даюць высокую ацэнку работе настаўніцтва і асьветнікаў у гэтым напрамку. Але калі супаставіць усё гэта з задачамі сёньняшняга дня, дык нам шмат чаго яшчэ трэба зрабіць.

Трэці рашаючы год пяцігодкі патрабуе яшчэ большай энэргіі, яшчэ большага ўздыму энтузіязму на гэтым участку работы.

У некаторых таварышоў ад вялікіх посьпехаў у мінулым годзе закруцілася галава, яны спынілі работу, спадзяючыся на самацёк.

Мы павінны давесьці да кожнай школы, да кожнага «варштату» вопыт Масквы і Ленінграду, перакасеньне новых форм і мэтадаў работы, асноўнешай з якіх зьяўляецца культастафэта. Задача нашых савецкіх органаў у тым, каб яны былі на чале гэтай справы і дапамагалі масам справіцца з гэтымі задачамі.

Для нас відавочна, што на сёньняшні дзень мы павінны зьвярнуць асаблівую увагу, як на асноўнае ў справе усеагульнага навучаньня—на якасьць нашай вучобы.

Калі ў мінулым годзе было большменш здавальняюча ў адносінах укамплектаваньня нашых школ, калі на сёньняшні дзень у нас ёсьць амаль 20 тыс. настаўнікаў, дык якасьць нашых педагагічных кадраў пас не задавальняе.

Мы гаворым, што асноўная маса настаўніцтва, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, актыўна змагаецца за лінію партыі, актыўна прымае ўдзел у грамадзкай рабоце, але ёсьць шмат прагрэмадзкай рабоце, але ёсьць шмат прагрэмадзкай рабоце, але ёсьць шмат прарываў. Ня гледзячы на тое, што значна паленшыўся сацыяльны склад настаўніцтва, мы і зараз сустракаем у некаторых раёнах такіх настаўнікаў, якія ня могуць адказаць на пытаньне: што такое індустрыялізацыя краіны?

Якасьць кадраў павінна адпавядаць патрабаваньням рэканструкцыйнага пэрыяду

У трэцім рашаючым годзе пяцігодкі нам трэба мець такія кадры, якія адпавядалі-б поўнасьцю запатрабаваньням рэканструкцыйнага пэрыяду. Які педагог нам патрэбен на сёньняшні дзень? Я зьвярнуўся тут да пастановы партыйнай нарады па пытаньні народнай асьветы пры ЦК УсеКП(б).

Нам патрэбен педагог «матар'яліст—дыялектык, узброены марксыцка-ленінскай тэорыяй, марксыцкай педагогікай». Ці многа ў нас такіх педагогаў? —На жаль, вельмі мала. Асноўная маса настаўніцтва патрабуе вялікай тэарэтычнай і палітычнай перакваліфікацыі. Аб гэтым казалі і нашы асьветнікі са зьезду-ўсякай трыбуны.

Адгэтуль асноўная задача зьяўляецца барацьба за такога педагога, які адказваў-бы на 100 проц. патрабаваньням сучаснага рэканструкцыйнага пэрыяду. У нас мала педагогаў-камуністаў. За апошнія гады ў шмат якіх раёнах зьнізілася ідэйная праслойка сярод нашага настаўніцтва. З камсамолам у нас справа стаіць лепш. Мы дабіліся таго, што ў прымежных раёнах у складзе нашага настаўніцтва ёсьць ад 30 да 40 проц. камуністаў і камсамольцаў.

Пару слоў аб матар'яльным забесьпячэньні асьветнікаў.

Невыпадкова, што дэлегаты аб гэтым пытаньні амаль не гаварылі на зьезьдзе. Мы павялічылі матар'яльнае забесьпячэньне настаўнікаў на вёсцы на 27 проц. Палепшылася забесьпячэньне іх кватарамі, прыладамі і прадуктамі. Але на фоне гэтых перамог у нас ёсьць і прарывы, якія заключаюцца ў тым, што спажывецкая кааперацыя часта ня выконвае сваіх абавязкаў.

Ёсьць прарывы і па лініі прававога становішча. Калі саюзныя арганізацыі ня былі на чале прававога становішча асьветнікаў, мы бачылі шмат недарочнасьцяй у гэтай справе. Перад намі стаіць задача, якую паставіў Ільіч: узьняць настаўніцтва на такую вышыню, на якой яно ніколі не стаяла ні ў адной капіталістычнай краіне. Мы маем недвадцаць ў паасобных мясцох гэтай справы. Наша задача—дамагчыся 100 процантнага выкананьня задач, што пастаўлены ў гэтым напрамку партыяй і савецкай уладай.

Бязьлітасны адпор вылазкам клясавага ворага

Аб дыфэрэнцыяцыі шмат хто гаварыў на гэтым зьезьдзе. Я спынюся толькі на адным пытаньні.

У нас існуе памылковы погляд на працэс палітычнай дыфэрэнцыяцыі. Некаторыя таварышы кажуць, што палітычная дыфэрэнцыяцыя—гэта справа, якая павінна ісьці сама на сабе.

Супроць такой пастаноўкі пытаньня мы вялі барацьбу.

Клясавая барацьба паглыбляе гэту дыфэрэнцыяцыю. Цяпер вылучыліся заваліся два канцавосьсі: адно—наша, другое—школьніцкае. Мы павінны бязьлітасна біць на вылазках тых адзінак клясава-варожага элементу, якія дзе-ні-дзе маюцца ў нашых радах.

Нацыянальнае пытаньне па лініі нашага саюзу даволі ўсебакова высьветлена ў папярэдніх дакладах.

Необходна дабіцца, каб настаўніцкая маса на сёньняшні дзень зразумела сутнасьць вялікадзяржаўнага шавінізму як галоўнай небясьпекі. Вялікадзяржаўны шавінізм зьяўляецца спрыяльнай глебай для тых шкоднікаў, якія выяўляюцца іншы раз і ў настаўніцкім і ў рабочым і ў сялянскім асяродзьдзі.

За ўзмацненьне інтэрнацыянальнай рабсілы

Наш зьезд праходзіць пад дэвізам узмацненьня інтэрнацыянальнай сувязі. Як жыве настаўніцтва Украіны, РСФСР або іншых саюзных рэспублік можа некаторыя з нас і недаведаць, але аб настаўніцтве, напрыклад, Францыі, Польшчы, Нямеччыны—напэўна ніхто ня ведае...

Нам необходна ўзмацніць інтэрнацыянальную сувязь, необходна паслаць таварышом на работе, як мы працуем, навучыць іх свайму вопыту, расказаць аб сваіх дасягненьнях.

Нарэшце, таварышы, пытаньне пайсковай работы. Мне здаецца, што у нас работа па вапізацыі не стаіць на належнай вышыні. Калі мы разам з цэнтральным камітэтам партыі праводзілі агляд нашай работы, дык у Жлобіне, Рагачове мы сустракаліся з такімі фактамі, што дробна-каліберная вінтоўка лежала ў шафе ды іржавела. У іншых арганізацыях ніякай работы па вапізацыі не вялося. Трэба раз назаўсёды ўсьвядоміць, што недацэнка пайсковай работы ёсьць яраша правага апартунізму.

Необходна дапамагчы арганізацыям Асоавіяхіму аддаць больш увагі пытаньням міжнароднага становішча. Трэба дабіцца, каб школы будавалі усю сваю работу так, каб яна выходзіла з задач умацаваньня абароназдольнасьці нашай краіны.

Ні аднаго настаўніка па-за ўдарніцтвам

Цэлы рад задач на перабудове нашай саюзнай работы выкладзіць з пастановы V пленуму ЦСПСБ. Пленум паставіў перад сабой адказьнейшыя задачы. Іх трэба давесьці да ведама кожнага асьветніка, каб ён на грунце гэтых дырэктыў будаваў сваю работу. Наша грамадзкасьць павінна дапамагчы ў гэтым настаўніцтву.

Толькі тады, калі мы разгорнем сапраўдную бальшавіцкую самакрытыку, калі будзем прадаваць не як саматужнікі, а будзем «кааперавацца», ісьці рукой у руку з камсамолам, пад кіраўніцтвам партыі, мы зможам выканаць ускладеныя на нас задачы.

Мы павінны праводзіць усю нашу работу пад кіраўніцтвам мясцовых партыйных арганізацый.

Да наступнага настаўніцкага зьезду мы павінны прыйсьці з такімі вынікамі, каб ня было ні аднаго настаўніка па-за ўдарніцтвам.

Камсамол--ударная брыгада на фронце нацыянальна-культурнага будаўніцтва

(З ДАКЛАДУ ТАВ. РУБЕНЧЫКА)

Таварышы! Пастаноўка дакладу Цэнтральнага Камітэту ЛКСМБ на даным зьезьдзе мае вялікае палітычнае значэньне. Для таго, каб зрабіць аналіз удзелу камсамолу ў культурным будаўніцтве, трэба спыніцца на агульнай характарыстыцы работы камсамолу ў сацыялістычным будаўніцтве.

Камсамол, перш за ўсё, ёсьць палітычная арганізацыя, якая пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі павінна вырашаць задачу сацыялістычнага будаўніцтва, вырашаць задачу набудовы сацыялізму ў нашай краіне.

Мы супроць голага культурніцтва, але за ўдзел камсамолу ў культурным будаўніцтве.

Ленінскі камсамол, які зьяўляецца кіраўніком рабочай і сялянскай моладзі, у праграме сваёй мае заўсёды аснову—прыводзіць камуністычнае выхаваньне падрастаючага пакаленьня.

Гэта наш выходны пункт, наша выходная задача.

Камсамол на працягу доўгіх гадоў змагаўся з апартунізмам у сыстэме органаў народнай асьветы. Ленінскі камсамол першы паставіў пытаньне аб арганізацыі фабзавучу, аб рэарганізацыі сыстэмы народнай асьветы і палітэхнізацыі школ.

Рэканструкцыйны пэрыяд дае нам магчымасьці паскорыць вырашэньне дэмага раду мерапрыемстваў у ажыцьцяўленьні палітэхнізацыі і ліквідацыі пісьменнасьці сярод працоўных. Гэты пэрыяд адзначаецца абвастрэньнем клясавай барацьбы, якая мае месца і на ідэалёгічным фронце, зьяўляючыся ў першую чаргу барацьбою за моладзь.

Адной з галоўнейшых задач, якія стаяць па сёньняшні дзень перад камсамолам і настаўніцтвам — гэта правядзеньне выразнай клясавай лініі на ідэалёгічным фронце, без якой немагчыма ажыцьцявіць задачу культурнага будаўніцтва.

Мне здаецца, што другое пытаньне, якое стаіць перад намі—гэта барацьба ня толькі за колькасныя паказальніці ў культурным будаўніцтве, але барацьба і за якасьць. Калі спыніцца на паасобных участках культурнага будаўніцтва, дык можна бачыць, як якасьць нашай работы кульгае на абедзьве нагі. Вазьмеце пытаньне усеагульнага навучаньня. Наша грамадзкасьць, нашы камсамольскія арганізацыі яшчэ не зрабілі ўсяго, каб замацаваць тыя дасягненьні, якія мы маем у галіне ўсеагульнага навучаньня.

У падрыхтоўцы педагагічных кадраў, як адзначыў тав. Платун, ёсьць рад дасягненьняў. Мы паслалі у пэдтэхнікумы і ВНУ шмат камсамольцаў, але якасьць падрыхтоўкі нашых студэнтаў нельга лічыць здавальняючай.

Дазвольце зараз перайсьці да пытаньня піянэрскай работы. Нашы піянэрскія арганізацыі, якія налічваюць каля 100.000 піянэраў, маюць шмат посьпехаў на камуністычным выхаваньні дзяцей і на ўдзеле ў сацыялістычным будаўніцтве.

Але наша пралетарская грамадзкасьць на сёньняшні дзень не аддае належнай увагі піянэрскім арганізацыям, паасобныя зьвяньні органаў народнай асьветы таксама недацэньваюць іх значэньня.

Зараз, як ніколі, павінна быць шчыльная сувязь паміж камсамолам і настаўніцтвам. Камсамол і настаўніцтва павінны весьці барацьбу за марксыцка-ленінскія прынцыпы ў мэтодыцы.

Мы разгарнулі работу па палітэхнізацыі. За гэтую работу павінны ўзяцца разам і камсамол і настаўніцтва.

Асабліва павінна быць замацавана сумесная работа ў справе перабудовы нашых культурных устаноў. Настаўнік на вёсцы — гэта агітатар за калгасы, актыўны ўдзельнік грамадзкай работы, удзельнік у культурным будаўніцтве. Мы шчыльна зьвязаны з вамі па наладжваньні сыстэмы сельска-гаспадарчарчай асьветы. Мы на вёсцы змагаемся за ШКМ, вялікую работу праводзім па ліквідацыі пісьменнасьці, і на вёсцы паміж камсамолам і настаўніцтвам павінна быць шчыльная сувязь.

На X-м зьезьдзе камсамолу мы канстатавалі, што работа камсамолу і яго тэмпы адстаюць ад тэмпаў культурнага будаўніцтва, што паасобныя зьвяньні арганізацыі маюць палітычныя прарывы ў нацыянальна-культурным будаўніцтве.

У чым сутнасьць гэтых прарываў? Сутнасьць у тым, што мы невыстарчальна змагаемся супроць вялікадзяржаўнага шавінізму, які зьяўляецца галоўнай небясьпекай на даным этапе, не разарнулі выстарчальнай барацьбы з контр-рэвалюцыйным беларускім нацыянал-дэмакратызмам. Сутнасьць гэтых прарываў яшчэ і ў тым, што мы не паставілі на належную вышыню справу беларусізацыі.

І зараз наша задача зводзіцца да таго, каб максымальна ўзмацніць работу па беларусізацыі, узмацніць барацьбу з рознага роду шавінізмамі, асабліва — вялікадзяржаўным. У гэтай рабоце настаўнікі павінны прысьці на дапамогу камсамолу.

Ад IX да X зьезду саветаў

Посьпехі БССР у справе ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі

Два гады, якія прайшлі з часу IX-га Усебеларускага зьезду саветаў, зьяўляюцца першымі двума гадамі пяцігодкі. За гэты час карэнным чынам перабудована гаспадарчы і культурны твар Савецкай Беларусі.

Наша прамысловасьць ня толькі гігантскі вырасла колькасна, але яна ўся рэарганізавана на зусім новых падставах. У выніку шпаркага тэмпу разьвіцьця прамысловасьці, яе прадукцыя нераўнае даванню больш чым у тры разы. Значна павялічыўся лік прамысловых рабочых. Разам з тым вырасла і разьвілася кааперавацая саматужная прамысловасьць як у горадзе, так і ў мястэчку і на вёсцы. Ліквідавана ў асноўным беспрацоўе. Побач з ростам пралетарыяту БССР ідзе сыстэматычнае палепшэньне яго дабрабыту.

Адначасова з вялізарнымі посьпехамі ў разьвіцьці прамысловасьці мы маем і значны рост сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі—саўгасаў і калгасаў. Выкрыцьцё і ліквідацыя прыпчапаўшчыны, якая імкнулася перавесьці сельскую гаспадарку ў БССР на шлях капіталістычнага разьвіцьця і гэтым дапамагчы кандэмам у іх контр-рэвалюцыйных імкненьнях рэстаўраваць уладу буржуазіі і памешчыкаў, набліжэньня рабочай клясы і працоўнага сялянства вялікі задач сацыялістычнай гаспадаркі—вось магутны сагар цацыярэньня і узмацненьня саўгасу за гэты час і шырокага разгортваньня калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

За апошнія пятгара-два гады ажыцьцяўленьня плошча пад саўгасамі павялічана больш чым у тры разы, а процант калектывізаванай зямельнай плошчы дасягае звыш дваццаці. Калі да гэтага дадаць, што рост прамысловасьці БССР перавышае рост прамысловасьці на Саюзе ССР (169,1 проц. у БССР супроць 124 проц. па Саюзе ССР), дык стане зусім зразумелым, што правільнае вырашэньне нацыянальнага пытаньня, якое заключаецца ў тым, каб зьнішчыць тую адсталасьць (гаспадарчую, палітычную і культурную) нацыянальнасьцяй, якую яны атрымалі ў спадчыну ад мінулага, каб даць адсталым народам магчымасьць дагнаць цэнтральную Расію ў дзяржаўных, культурных і гаспадарчых адносінах» (Сталін)—за апошнія гады стала ў нас рэальнай сапраўднасьцю.

У Савецкай Беларусі стварэецца груп тоўная гаспадарча-сацыялістычная база для ліквідацыі сьляпой эканамічнай пірофўнасьці, якая засталася нам у спадчыну ад палітыкі царызму і капіталізму.

За апошнія два гады мы маем таксама вялізарнейшыя дасягненьні ў справе будаўніцтва сацыялістычнай нацыянальнай культуры. Савецкая Беларусь зьяўляецца першай з усіх рэспублік Савецкага Саюзу, якая ўвяла ўсеагульнае абавязковае навучаньне. Мы ахапілі школамі каля 95 проц. дзяцей узросту ад 8 да 11 год. Ліквідыкамі ахоплена за два гады каля 700.000 дарослага працоўнага насельніцтва. Колькасьць хат-чытальняў павялічылася больш чым у два разы (307 у 1927-28 г. і 650 у 1929-30 г.).

Вялізарныя посьпехі мы маем таксама ў справе разьвіцьця самай адсталай у мінулым галіны культурнага будаўніцтва—сярэдняй і вышэйшай прафэсіянальнай асьветы: замест 30 тэхнікумаў у 1928-29 г. мы на сёньняшні дзень маем 65, замест 10 школ фабзавуча—20; колькасьць вышэйшых навучальных устаноў, таксама і рабфакаў вырасла ў тры разы: вышэйшых навучальных устаноў было ў 1928-29 г.—4, а зараз 12; рабфакаў у 1928-29 г. было 8, а зараз 24.

Мы маем нябывалы рост выдавецкай справы. Адным Белардзяржвыдавецтвам выдана ў 1929-30 г. 1815 розных назваў кніжак, часопісяў. У савецкай Беларусі маецца 20 газэт, з іх цэнтральных—14 і раённых—32.

Нашы дасягненьні ў галіне будаўніцтва культуры нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьмесьце характарызуюцца ня толькі вышэйзгадванымі колькаснымі паказальнікамі,—значныя посьпехі мы маем таксама на лініі якаснага палепшэньня нашай культурнай справы. Так, напрыклад, значна вырасла рабочая праслойка ва ўсіх нашых навучальных установах, асабліва ў рабфаках. Закладзена значная база па падрыхтоўцы пралетарскіх навуковых кадраў: у сучасны момант розными навучальнымі і навуковымі установамі падрыхтоўваюцца 260 аспірантаў—выкладаў з рабочых і працоўных сялянскіх мас. Разам з гэтым шырока мабілізавана марксыцка-навуковая грамадзкасьць на змаганьне з упыўвамі буржуазных тэорый у розных галінах навукі.

Савецкая Беларусь мае значныя посьпехі ў справе беларусізацыі савецкіх і грамадзкіх устаноў, і асабліва ў справе беларусізацыі нижэйшых і сярэдніх школ, якія, за выключэньнем школ, абслугоўваючых нацыянальнасьці, вядуць работу на беларускай мове. У прафэтэхнічных сярэдніх і вышэйшых 66, у пэдтэхнікумах і на пэдфаку БДУ выкладаньне на беларускай мове праводзіцца поўнасьцю. Нізавы савецкі апарат і апарат грамадзкіх арганізацый вядзе работу выключна на беларускай мове.

Разам з тым за апошнія часы назіраецца недацэнка справы беларусізацыі паасобнымі зьвяньнямі савецкіх і грамадзкіх устаноў і арганізацый. З прычыны гэтага кастрычніцкі пленум ЦК КП(б)Б паставіў пытаньне аб беларусізацыі на ўсю шырыню, арыентуючы партарганізацыі і пралетарскую грамадзкасьць на ліквідацыю раду правадыроў у галіне беларусізацыі, у прыватнасьці, на працягу сьнежня месяца праводзіўся спэцыяльны месячнік праверкі беларусізацыі і работы сярод нац меншасьцяй.

На фоне агульнага росту эканамічнага і культурнага разьвіцьця краіны мы маем значныя посьпехі ў справе ўздыму эканамічнага і культурнага дабрабыту нацменшасьцяй, якія насяляюць БССР, у справе ўцягненьня рабочых і працоўных нацменшасьцяй у сацыялістычнае будаўніцтва. У гэтых адносінах трэба з асаблівым задавальненьнем адзначыць нашы посьпехі на лініі ўздараўленьня эканамічнага і бытавога жыцьця працоўнага яўрэйскага насельніцтва. Яшчэ ўсім пядаўна мы прымушаны былі канстатаваць, што «колькасна яўрэйская беднота, якая складаецца з беспрацоўных саматужнікаў, беспрацоўных рабочых, былых служаных і г. д., зьяўляецца найбольш пыматлікім пластом мястэчка; што «шырокія працоўныя яўрэйскія масы царскай палітыкай загнаны ў эканамічны тупік» і што «на вырашэньне так званага яўрэйскага пытаньня неабходна зьвярнуць самую сур'ёзную ўвагу». Зараз мы можам сьмела сказаць, што, дзякуючы шпаркаму тэмпу разьвіцьця нашай прамысловасьці і сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі з аднаго боку і з другога асобным мерапрыемствам, ужытым кампартыяй і савецкім ўрадам на эканамічным упарадкаваньні мястэчак, гэты «тупік» у асноўным ліквідаваны і «вострасьць яўрэйскага пытаньня» наступова адпадае.

За апошнія часы значная колькасьць яўрэйскай працоўнай бедноты ўцягнута ў вытворчую

1.200 ГАСПАДАРАК УСТУПІЛА У КАЛГАСЫ

Клімавіцкага раёну за час перавыбараў кіруючага складу калгасаў

ПАД ЗНАКАМ ПАШЫРЭНЬНЯ КАЛГАСНАГА РУХУ ПРАХОДЗЯЦЬ РАЁННЫЯ ЗЬЕЗДЫ КАЛГАСАЎ

ПАПЯРЭДНІЯ ВЫНІКІ

На масцох не прытрымліваюцца вызначаных Белкалгасцэнтрам тэрмінаў правядзеньня зьездаў і перавыбарчай кампаніі у калгасах. У выніку перавыбары ў калгасах і раённыя зьезды праведзены толькі у 50 проц. усіх раёнаў.

Раённыя зьезды калгасаў праходзяць пры вялікай актыўнасьці калгасьнікаў і аднаасобнікаў-беднякоў і сераднякоў.

У цэнтры ўвагі калгасных зьездаў, амаль на ўсіх раёнах, стаіць пытаньне **арганізацыі працы ў калгасах.** Некаторыя раённыя зьезды адзначалі, што за апошні час значныя посьпехі дасягнуты у газіне ўкараненьня мэтадаў сацспаборніцтва і ударніцтва.

У радзе раёнаў зьезды калгасаў былі адзначаны калгасьнікамі і аднаасобнікамі арганізацыйны чырвоны абозаў са зборжам ды ільном. **У Каралінскім раёне ў адзнаку правадзімага зьезду калгасаў была арганізавана масавая вывазка песу.**

Цікавую ініцыятыву праявіў **Лагойскі** раённы зьезд калгасаў. Зьезд працаваў адзін дзень, пасьля чаго ўсе дэлегаты мабілізавалі сябе і разьехаліся ў сельсаветы для правядзеньня масавай работы па калгасным будаўніцтве.

Перавыбарчая кампанія і раённыя зьезды калгасаў праходзяць пад знакам умацненьня калгаснага прыліву і арганізацыі новых калгасаў. **У Клімавіцкім раёне за час з 1-га па 10-га лютага ўступіла ў калгасы 1.200 гаспадарак. У Каралінскім раёне за час зьезду калгасаў арганізаваны 4 новыя калгасы і ўступіла ў існуючыя 175 гаспадарак. У Чачэвіцкім раёне арганізавана 6 новых калгасаў і г. д.**

Побач з раёнамі, якія своечасова падрыхтаваліся да правядзеньня кампаніі перавыбараў кіруючага складу калгасаў і раённых зьездаў, ёсьць раёны, якія адчыніла адносьліся да гэтай важнейшай кампаніі, што фактычна прывяло да срыву перавыбараў і зьездаў калгасаў **(Уэда, Лепель).**

Правядзеная кампанія па перавыбарах значна ўмацніла кіруючыя органы калгасаў і райкалгассаюзаў. У новыя калгасы пераходзяць старыя калгасьнікі, якія маюць вопыт у галіне кіраўніцтва.

У склад праўленьняў калгасаў і райкалгассаюзаў абрана шмат 25-цітысячнікаў, рабочых і батракоў. Як на недахоп, трэба паказаць на слабае ўсё яшчэ ўцягненьне у кіруючыя органы жанчын-калгасьніц.

16 новых калгасьнікаў

ПАСЬЛЯ АЧЫСТКІ ПРАЎЛЕНЬНЯ АД ВАРОЖЫХ ЭЛЕМЭНТАЎ

БУДА-КАШАЛЕЎСКАЕ.

На справаздачна-перавыбарчым сходзе калгасу **«Пралетары»** (Буда-Кашалёўскі раён) прысутнічала шмат бедняко ў і сераднякоў аднаасобнікаў.

Пк справаздачы праўленьня аб яго гадавой рабоце разгарнуліся шырокія спрэчкі. Калгасьнікі і выступаючыя аднаасобнікі ўзялі пад жорсткую самакрытыку работу старога праўленьня, якое было засьмечана варожымі элемэнтамі.

У выніку злачынной дзейнасьці праўленьня ніякага прыліву ў калгас ня было. На сходзе высьветлілася, што калгас ніякай падрыхтоўкі да другой бальшавіцкай весны не вядзе. Насеньне не ачышчана. С.-г. інвэнтар не адрамантаваны. Лесаматар'ял для будаўніцтва ня вывезен.

Пасьля выкрыцьця шкодніцкай, кулацкай дзейнасьці кіраўніцтва калгасам 16 бядняцка-сераднацкіх аднаасобных гаспадарак падалі заявы з просьбай прыняць іх у калгас.

У склад новага праўленьня выбрана 7 калгасьнікаў, з іх—1 рабочы, тры беднякі і тры сераднякі.

Калгасьнікі абвясьцілі сябе ўдарнікамі на ліквідацыі прарыву, якія маюцца у калгасе, і абавязаліся па-баявому правесьці другую калгасную вясну, арганізаваць магутны прыліў бядняцка-сераднацкіх гаспадарак у калгасы.

Новікаў, Бадэка, Рабіновіч.

МАСАВУЮ РАБОТУ—У ЦЭНТР УВАГІ

Папярэднія вынікі кампаніі перавыбараў праўленьняў калгасаў па 12 раёнах паказваюць рад прарываў у ходзе гэтай важнейшай кампаніі.

Перавыбары па чыстцы раёнаў, яўна невыстарчальна ўвязаны з арганізацыяй новага калгаснага прыліву. Райкалгассаюзы не паставілі ў цэнтр сваёй увагі масавай работы ў гэтай галіне. Па 12 раёнах за 15 дзён перавыбараў арганізавана толькі 51 калгас—калектывізаваны 1.572 двары.

Наведваньне калгасьнікамі перавыбарчых сходаў у сярэднім дасягае толькі 74 проц., а па некаторых раёнах—ніжэй. Так, па Мсьціслаўскім раёне з 2.300 калгасьнікаў у выбарах праўленьняў прынялі ўдзел—толькі 1.400. **Наведваньне-ж калгасьнічамі не перавышае 66,6 проц.** Значная частка райкалгассаюзаў ня выканала дырэктыў аб арганізацыі па час перавыбараў часовых ліквідацый, што зьяўляецца адным з асноўных прычын слабага ўдзелу жанчын у перавыбарах.

Кульгае масавая работа сярод аднаасобных бядняцка-сераднацкіх гаспадарак. У разультаце гэтага на перавыбарчых сходах прысутнічала толькі каля 30 проц. аднаасобнікаў да агульнае колькасьці прысутных калгасьнікаў. **У Касьцюковіцкім і Круглянскім** раёнах, дзе была праведзена апартуністычная недаацэнка масавай работы з аднаасобнікамі, і ў калгасных сходах аднаасобнікі ня прымалі ніякага ўдзелу.

Дырэктыва аб максымальным уцягненьні жанчын у склад праўленьняў калгасаў выкопваецца дрэнна. **У сярэднім жанчыны складаюць 20,3 проц. ад агульнага ліку перавыбраных праўленьняў.** Недацэнчальнае ігнараваньне дырэктывы праўдена ў Касьцюковіцкім раёне— у праўленьні 20 калгасаў, выбрана толькі 13 жанчын, а па Кохана-ўскім раёне—па 18 калгасах—4 жанчыны.

Слабы ўдзел у кіруючай калгаснай рабоце адведзен камсамольцам—5,8 проц. Камуністаў выбрана 24,5 проц. агульнага ліку членаў праўленьняў, рабочых—2,6 проц., 25-тысячнікаў—2,6 проц., батракоў—11,9 проц., бедняко ў—42,1 проц., сераднякоў—38,4 проц. У праўленьні 20 калгасаў Касьцюковіцкага раёну не ўвайшоў ні адзін камсамолец.

Увязаная з перавыбарамі чыстка калгасаў паказала вялікую засьмечанасьць раду з іх кулацкімі элемэнтамі. Так, з калгасаў Сьвіслацкага раёну вычышчана 30 кулакоў, Гомельскага—20, Чачэрскага—17 і г. д.

Кампанія слаба ўвязваецца з вылучэньнем лепшых калгасьнікаў на работу ў новыя калектывы. Многія райкалгассаюзы яшчэ нават ня вызначылі кантрольных лічбаў і калгасаў, якія павінны вылучыць людзей. Гэту задачу ўжо выканалі толькі калгасы Карадзінскага раёну (далі 9 чал.), Капаткевіцкага раёну (12 чал.) і Жыткавіцкага раёну (12 чал.).

Адзначаныя прарывы зьяўляюцца вынікам яўна слабага кіраўніцтва з боку райкалгассаюзаў, а таксама недаацэнкі значэньня кампаніі з боку некаторых кіруючых раённых арганізацый.

ЦК КП(б)Б даў дырэктыву ўсім райкомам партыі ўзмацніць кіраўніцтва перавыбарамі і забясьпечыць поўнае выкананьне пастановы аб удзеле жанчын у кіруючых органах калгасаў. Калгасцэнтр БССР прапанаваў райкалгассаюзам скасаваць перавыбары ў тых калгасах, дзе наведваньне было ніжэй 60 проц. і ня выбрана ні адной калгасьніцы ў склад праўленьня.

Гэтыя дырэктывы павінны быць поўнасьцю выкананы.

За пяцігодку—у чатыры гады

КАПЫЛЬ (Брыгада «Зьвязды» і «Праўды»). 2-гі зьезд калгасаў Капыльшчыны прайшоў пад лёзунгамі разгортваньня калектывізацыі, безьлітаснай барацьбы з клясавым ворагам і яго падгалоскамі, барацьбы за бальшавіцкія тэмпы у падрыхтоўцы да другой бальшавіцкай сяўбы, за пяцігодку за чатыры гады.

Зьезд абвясьціў слабе мабілізаваным на ліквідацыю прарываў і абраў 6 брыгад з лепшых калгасьнікаў для разгортваньня масавай работы па калектывізацыі і падрыхтоўцы да другой бальшавіцкай сяўбы.

Клюнко, Фрыд, Мацьвеенка.

Самацёк не ліквідаваны

У Асіпавічах адбылася куставая нарада старшынь райкалгассаюзаў Асіпавіцкага, Чачавіцкага, Старобінскага, Бабруйскага, Сьвіслацкага, Старадарожскага і Чырвона-слабодзкага раёнаў. На нарадзе былі заслуханы даклады раёнаў аб ходзе перавыбараў праўленьняў калгасаў, узмацненьні калгаснага прыліву і падрыхтоўкі да веснавой сяўбы.

Выявілася, што рад раёнаў ніякай масавай работы па разгортваньні калгаснага руху не праводзяць.

З боку некаторых работнікаў назіраецца апартуністычная недаацэнка важнейшых палітычных кампаній. Так, старшыня **Старадарожскага** райкалгассаюзу на нарадзе заявіў:

— Згуртавалі ўсе кампаніі ў адзін пярыяд. Навошта праводзіць перавыбары праўленьняў.

У выніку перавыбары праўленьняў калгасаў па раёне не распачаты. Гадавыя справаздачы складзены толькі па 6 калгасах; вытворчыя пляны — у трох калгасах з 40 існуючых. Абмалот у большасьці калгасаў яшчэ не скончан. Дагаворы з МТС не заключаюцца.

Па Капыльскім раёне калектывізацыя праходзіць таксама самацёкам. Афармленьне калгасаў ідзе вельмі марудна. **З 10 новых калгасаў, арганізаваных за апошні час, афармлена толькі 4.**

У Азарыцкім раёне силянам прыходзіцца зварачацца ў раённыя арганізацыі з просьбай дапамагчы арганізаваць калгас. **Самі арганізацыі ніякай масавай работы не вядуць. Склады райкаапсаюзу завалены мапатарнямі, якія стаяць бяз руху, бо няма да іх рухавіку.**

У Грэскім раёне аб калектывізацыі раённыя арганізацыі ня думаюць. Арганізаваныя 6 новых калгасаў вымушаны былі па некалькі раз хадзіць і прасіць, каб іх афармілі. Рамонт с.-г. інвэнтар не праводзіцца. Саўгасы адмаўляюцца раманціваць інвэнтар калгасаў з-за адсутнасьці жалеза. Калгасы здаюць райкаапсаюзу адналямешныя плугі, але замест іх не атрымліваюць больш складаных машын.

У Любанскім раёне да гэтага часу не завезена мінэральнае ўгнаеньне для камуны «БВА».

Наогул амаль усе перанічаныя раёны праяўляюць самацёчныя настроі. **Работай ініцыятыўных груп і вярбовачных арганізацый ніхто ня цікавіцца.** Слаба праходзіць ва ўсіх гэтых раёнах падрыхтоўка да веснавой сяўбы. **А.**

„Усе сілы—на будаўніцтва калгасаў"

ЛОЕЎ. 13-га лютага адбыўся раённы зьезд калгасаў **Лоеўскага раёну.**

У часе працы зьезду калгасы імя **Дзяржынскага і «Чырвоная ніва» арганізавалі чырвоныя абозы збожжа.**

Перадавікі-калгасьнікі заявілі:

— Мы ўсе свае сілы аддамо на будаўніцтва калгасаў, на арганізацыю прыліву ў калгасы бядняцка-сераднацкіх аднаасобных гаспадарак, на рашучую барацьбу з кулацкай агентурай, за суцэльную калектывізацыю.

Зьезд абавязаўся шляхам разгортваньня масавай работы дабіцца да вясны калектывізацыі 40 проц. гаспадарак раёну. **Апанас Карпенка.**

Перавыбарчая кампанія на паперы

БРАГІНА.

Справаздачна - перавыбарчая **кампанія** праўленьняў калгасаў на **Брагінскім** раёне **праходзіць зусім нездавальняюча.**

Большасьць калгасаў не падрыхтавана да справаздачна-перавыбарчай кампаніі. Вылучаныя рэйкомам партыі таварышы для правядзеньня гэтай работы, фактычна нічога ня робяць.

А між тым акол правядзеньня гэтай важнай палітычнай кампаніі патрэбна было мабілізаваць шырокія масы калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў аднаасобнікаў з тым, каб выкрыць усе недахопы, якія мяшаюць у рабоце калгасаў.

У радзе калгасаў раёну ёсьць вялізарныя недахопы. На чале некаторых калектыўных гаспадарак стаяць ненадзейныя і чужыя нам людзі, якія праводзяць разлагаючую работу ўнутры калгасаў.

Многія калгасы і па сёнешні дзень не разьмеркавалі ўраджаю. З-за дрэннай пастаноўкі справы рахункаводства 36 калгасаў раёну не зрабілі гадавых справаздач.

Работа па падрыхтоўцы да веснавой сяўбы таксама ідзе вельмі марудна. Пляны засыпкі насенных фондаў ня выкананы. Насеньне ня чысьціцца.

Трэба ўдарыць па апартуністычнай недаацэнцы кампаніі, якая навіна быць зараз-жа разгорнута.

Молат.

Попелу ня зьбіраюць

Паркамам БССР на пасеўную кампанію бягучага году вызначаў наступную колькасьць штучных угнаеньняў: **калійнай солі** для саўгасаў 8.740 тон, для калгасаў — 1.900 тон; **азотных угнаеньняў** для саўгасаў 1.320 тон, калгасаў —330 тон; **фасфарытнай мукі** саўгасам —13.000 тон, калгасам — **25.500 тон; фасфарытаў** саўгасам — 17.140 тон, калгасам — 27.460 тон.

Уся гэта колькасьць штучных угнаеньняў разьмеркавана па раёнах у адпаведнасьці з іх спэцыялізацыяй.

Забесьпячэньне пасеўнай кампаніі фасфарытнай мукой зрываюцца прадпрыемствамі Белхэмпраму, якія ня выконваюць сваіх заданьняў.

Кампанія па зборы попелу амаль не разгорнута. Толькі некаторыя раёны прыслалі весткі аб праробленай у гэтай галіне рабоце. **У Боркавіцкім** раёне сабрана ўсяго 130 цнт. попелу, у **Сьмілавіцкім** — 58 цнт., **Чашніцкім** — 100 цнт., **Клічаўскім** — 15 цнт.

АБ РЭАРГАНІЗАЦЫІ НАРОДНАГА КАМІСАРЫЯТУ ЗЯМЛЯРОБСТВА БССР У АБ'ЯДНАНЫ НАРОДНЫ КАМІСАРЫЯТ

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР, на аснове пастановы ЦВК Саюзу ССР «Пра стварэньне Народнага Камісарыяту Зямляробства Саюзу ССР» за 7 сьнежня 1929 г. (Збор з. СССР за 1929 г. № 75, арт. 718) пастанаўляюць рэарганізаваць Народны Камісарыят Зямляробства БССР у аб'яднаны Народны Камісарыят

Старшыня ЦВК БССР А. ЧАРВЯКОЎ.

Нам. старшыні СНК БССР К. БЭНЭК.

Сакратар ЦВК БССР А. ХАЦКЕВІЧ.

Барацьба за фінплян—барацьба за пяцігодку за 4 гады

ФІНОРГАНЫ ПАВІННЫ ўзяць баявыя тэмпы

Прымусім кулака ў найкарацейшы тэрмін унесьці ўсе плацяжы

Менск павінен выканаць свой фінплян

Пастанова бюро менгаркому КП(б)Б

1. Бюро гаркому адзначае: зусім нездавальняючыя тэмпы мабілізацыі сродкаў па горадзе і раёне, дрэннае выкананьне заданьняў за студзень (86 проц.), што стварае пагрозу зрыву квартальнага пляну.

2. Злачынна нядбайныя адносіны да мабілізацыі сродкаў з боку сельскай спажывецкай кааперацыі, калгаснай крэдытнай сыстэмы, мепаддзяленьня Дзяржбанку і сампрамкааперацыі. Значныя нядоімкі па с.-г. падатку, самаабкладаньні і страхоўцы. Права-апартуністычную практыку райкалгассаюзу і райкаапсаюзу, якія нават не прыступілі да збору наяпакапленьня і рэалізацыі мэтавых пазык;

3. Работа па аднаразовым зборы як па горадзе, так, асабліва, па вёсцы разгорнута зусім нездавальняюча. Нездавальняючае становішча ў рэалізацыі пазыкі «Пяцігодка — за чатыры гады» па горадзе (88 проц.) і зусім дрэннае па раёне (60 проц.).

Надаючы выключна важнае палітычнае значэньне выкананьню фінансавага пляну, **прапанаваць:**

1. Ўсім гаспадарнікам, ячэйкам КП(б)Б і фракцыям кааперацыйных арганізацый прыняць самыя рашучыя меры да разгортваньня працы па мабілізацыі сродкаў па ўсіх галінах з тым, каб забясьпечыць 100 проц. выкананьне і перавыкананьне квартальнага пляну, разгарнуўшы сацспаборніцтва і ўдарніцтва паміж паасобнымі рабочымі калектывамі, прадпрыемствамі, установамі і сельсаветамі на арганізацыю саджэнашчы і дапамогі ў поўнай рэалізацыі квартальнага пляну на горадзе і раёну.

2. З мэтай дапамогі сельсаветам у ліквідацыі нядоімак, а таксама своечасовага правядзеньня аднаразовага збору, мабілізаваць 20 таварышоў для дапамогі сельсаветам па арганізацыі і ўзмацненьні мабілізацыі сродкаў, забараніўшы гэтым таварышом выезд з сельскіх саветаў да поўнага выкананьня пляннавага заданьня сельскага савету. Фракцыі гарсавету мабілізаваць ня менш 20 членаў гарсавету для накіраваньня на сельскіх саветах для гэтай-жа мэты.

3. Фракцыі гарсавету, прафарганізацыям і парт'ячэйкам максымальна разгарнуць кампанію па аднаразовым зборы з тым, каб да 1-га сакавіка па вёсцы і 10-га сакавіка па горадзе поўнасьцю скончыць збор гэтага фонду.

4. Адзначаючы злачынна-нядбайныя адносіны з боку ячэек і сельскіх саветаў да спагнаньня плацяжоў з кулацкіх гаспадарак і злосных неплацельшчыкаў, што ўплывы рэвалюцыйных арганізацый зьмяншаюцца, тут Галуйко значна перавялічвае сілу і магчымасьці свайго тэрарыстычнага апарату і сам у сваіх выступленьнях прымушае заняцца пешта процілеглае таму, што ён гаварыў вышэй.

«Для мяне, які арганізоўваў па даручэньні ББ,—гаворыць Галуйко,—выбары на крэсах, сапраўдным супрацьўнікам былі камуністычныя партыі. Нам вельмі дапамог п. Пужак в ПІС, у галоўнай выбарчай камісіі, якая ня дапамозе графаліста ліквідавала дзяржаўныя камуністычныя сьпісы, сярод іх—сьпіс «Змаганьня». Калі-ж мясцовыя камуністычныя сьпісы не палічы да рук акруговых выбарчых камісій, то гэта сьведчыць толькі аб тым, што наша адміністрацыя дзейнічае выразна і энэргічна».

У гэтай заяве цынізм акупанта зьлучаецца з вымушаным прызнаньнем бязумоўнай сілы і магутнасьці камуністычных уплываў на Зах. Беларусі. Калі-б сапраўды, як гэта гаворыць Галуйко, уплывы камунізму былі-б незначнымі, або ўжось час зьмяншаліся, ці-ж варта было-б за ўрачыстай прамове на трыбуне польскага сойму запудзець аб тым, што «адзіна-моцным супраціўнікам» фашызму на ЗБ была і ёсьць камуністычная партыя. Тут Галуйко не дапамагла яго спрытнасьць дыплёмата і вопытнага ашуканца мас. Камуністычная партыя зьяўляецца адзінай сілай, якая змагаецца супроць акупацыі, супроць фашысцкай дыктатуры, ўплывы якой, ня гледячы на ўсю старанную польскай адміністрацыі, па ўсе праяўленьні «кволага каханьня» Радзівілаў, Сапег, Галуйко і інш. да беларускага народу, узрастаюць з нястрымнай сілай.

Чаму такая вялікая ўвага аддаецца зараз Зах. Беларусі з боку кіруючых колаў Польшчы? Чаму так многа прыгожых слоў гаворыцца аб «добрым становішчы» беларускага народу? Чаму так узмоцнена зараз надрэсьлівае Галуйко магчымасьць таго, каб беларусы і украінцы сталі «роўнымі грамадзянамі польскай дзяржавы»? Чаму, урэшце, Галуйко так узмоцнена зараз падкрэсьлівае «права польскай культуры і польскай дзяржавы на свае ўсходнія акраіны»? Адказ на ўсе гэтыя пытаньні даюць самі-ж выступленьні Галуйко. У гэтых выступленьнях ён ня ў стане скрыць сваіх сапраўдных намераў і прагаварваецца аб тым, чаго не гаворыць у сваіх афіцыйных выступленьнях польскія дыпляматы.

У прамове ў сойме Галуйко заяўляе:

«Трэба лічыцца з тым, што ва пагранічнымі слупамі разьрываецца вялікі эксэрымэнт калектывізацыі, які хоча стварыць новы ісыхалёгічны і гаспадарчы тып. Мы гэтаму тыпу павінны супроцьставіць тып самастойнага гаспадара, які сядзіць на сваім уласным кавалку зямлі... Няхай селянін будзе і падалей беларусам ці «старообрядцем», але няхай ён стане селянінам з заходня-эўрапэйскай культурай».

Вось дзе разгадка ўсёй палітыкі польскага фашызму на Зах. Беларусі. Вось, дзе высьвятленьне сэнсу ўсіх выступленьняў з галоснымі абяцаньнямі—на словах, і жорсткім тэрорам, нацыянальным і сацыяльным уціскам—на справе. Супроцьстаўніцка калектывізацыі, якая стварае новы тып сялянскай гаспадаркі, і якая, ня гледячы на ўвесь паклёп нацыянал і сацыял-фашыстаў, уплывае рэвалюцыйна і на працоўныя масы Зах. Беларусі—у гэтым заключаецца задача фашысцкай палітыкі. Нацкаваць масы на БССР, узмацніць яшчэ больш кулацкі пласт «самастойных гаспадароў» і адначасова яшчэ шчыльней завінціць усе гайкі эксплёатацыі, уціску і тэрору ў адносінах да беднаты і сераднятва —вось пляны польскіх імпэрыялістаў, аб якіх прагаварваецца Галуйко. У адным з іншых сваіх выступленьняў, у артыкуле пад назвай «Крэсы», Галуйко пісаў:

... «Там, за гранічнай мяжой, таксама існуе беларускі рух, які мае на дапамогу сабе беларускі унівэрсытэт, Акадэмію Навук, беларускую народную асьвету, беларускую мову ва ўстановах, словам—ўсё тое, што ахапляецца разуменьнем Беларускай Савецкай Рэспублікі... Хіба ўсё гэта ня будзе мець уплыву на беларусоў у Польшчы?

Бязумоўна, што ня толькі будзе мець уплыў, але ўжо ўплывае, довадам чаго хаця-б зьяўляецца працэс Беларускай Грамады, які прывёў яе правадыроў, нацыяналістаў па перакопаньні у польскія турмы на абвінавачаньні у сумеснай рабоце з камунізмам»...

Зноў, і ў гэтай вытрымцы, як і ў папярэдній, выступае ясна бальшэ рэвалюцыйных уплываў на працоўныя масы Польшчы і Зах. Беларусі з боку Савецкай Беларусі і сацыялістычнага будаўніцтва. З гэтай бальні, з імпэрыялістычных імкненьняў на Ўсход вынікае ліквіманкавая падрыхтоўка да ўзброенага нападу на СССР. І Галуйко прапануе рэцэпты, па якіх польскі фашызм рыхтуецца да гэтай вайны і прабуе супроцьставіцца ўзрастаючым уплывам чырвонага Менску.

«Каб гэтага ня было (г. зн. узрастаючых уплываў Менску), мы ня бачым іншага выхаду, як толькі той, каб беларускі рух у Польшчы меў свой уласны цэнтр, каб ён узрастаў і развіваўся на дражджах польскай культуры... (г. зн. на службе польскай акупацыі А. А.). Толькі нацыянальна-сьвядомы беларус, але вызваны на (г. зн. контр-рэвалюцыянэр, нацыянал-дэмакрат, нацыянал-фашыст А. А.) заходняй культуры, супроцьстаўніцка ўплывам, якія ідуць з Масквы, Менску... З пункту погляду інтарэсаў Польшчы гутарка ідзе не аб тым, ці будуць на крэсах палякі ці беларусы, ці украінцы; справа ў тым, каб мяжа польскай дзяржавы была адначасова мяжой заходняй культуры» (г. зн. капіталізму, буржуазна-абшарніцкай эксплёатацыі А. А.).

Вось, дзе заканан сабака. Такім чынам, Галуйко расказвае адкрыта аб плянах польскага імпэрыялізму. У сьвятле гэтых апошніх выцытак становішча ясным прызначэньне і сэнс першых дэкларацыйных заяў аб становішчы на Заходняй Беларусі. Аказваецца, што, ня гледячы на ўсю балбатню нацыянал-фашыстаў на тэмы аб «зруйнаваньні беларускай культуры» ў Менску толькі таму, што арыштавана група нацыяналістаў, паводле заяў самога-ж Галуйко, Савецкая Беларусь і ажыцьцяўленьне ў ёй, пад кіраўніцтвам КП(б)Б, ленінскай нацыянальнай палітыкі, уплывае на ЗБ і ўсё яшчэ застаецца рэвалюцыйным цэнтрам, прыцягваючым да сябе сымпатыі мас. І барацьба гэтых уплываў, барацьба супроць БССР—вось выхад са становішча, з крызісу, вось мэты, якія пастаўлены польскім фашызмам, і для ажыцьцяўленьня якіх ён мабілізуе, разам са сваімі сіламі, і сілы беларускай нацыяналістычнай контр-рэвалюцыі.

Справа ясная. Пан Галуйко ў сваіх выступленьнях яшчэ раз прагаварваецца і раскрывае антысавецкія і варожыя пляны польскіх фашыстаў. Ён яшчэ раз цалкам салідарызуецца з нацдэмаўскай контр-рэвалюцыяй і гэтым самым нацьвярджае нашы шматлікія заявы аб наяўнасьці сувязі паміж арыштаванай групай нацдэмаў і польскім фашызмам. Ён яшчэ і яшчэ раз нацьвярджае надзвычайную на Зах. Беларусі абвостраную клясавай барацьбы і ўзрастаючых уплываў камуністычнай партыі. Усялякія там заігрываньні, усялякія там чуткі слоўцы нагробны фашызму толькі для таго, каб падрыхтаваць пазыцыі для антысавецкай вайны, каб бязьлітасна і жорстка задушыць узрастаючую рэвалюцыйную барацьбу мас.

Савецкі пралетарыят робіць усе патрэбныя высновы з факту узрастаючай небясьпекі вайны. Гэтымі высновамі зьяўляюцца высокія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва і ўзмацненьня абароназдольнасьці краіны. Гэтымі высновамі зьяўляецца цьвёрдае ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі і разгорнутае наступленьне на клясавага ворага. Гэта палітыка бальшавіцкай партыі будзе і надалей мабілізаваць вакол рэвалюцыйных пазыцый шырокія працоўныя масы заходня-капіталістычных краін. Калі міжнародная і польская буржуазія паспрабуе ажыцьцявіць свае крывавыя замеры, дык яна будзе мець перад сабой два фронты барацьбы—фронт барацьбы з магутнай Чырвонай арміяй Савецкага Саюзу і фронт барацьбы з пралетарыятам і працоўнымі масамі сваіх уласных краін.

Няхай гэтага не забываюць паны Галуйкі і да іх падобныя прадаўнікі польскага імпэрыялізму.

А. АЛЬШЭЎСКІ.

ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ НАРАСТАЮЧЫЯ ТЭМПЫ РАБОТЫ

ЦК КП(б)Б і СНК БССР за подпісамі т. т. **Шаранговіча і Бэнэка** паслана тэлеграма райкомам КП(б)Б і райвыканкомам, у якой раёнам прапануецца неадкладна ўзмацніць мабілізацыю сродкаў насельніцтва.

—Дырэктыва ЦК і ўраду —гаворыцца ў тэлеграме—аб спагнаньні да 10 лютага 70% аднаразовага збору з усіх платнікаў, аб поўным спагнаньні з кулакоў падатку да 15 студзеня і збору да 1-га лютага **ня выканана.**

—Катэгарычна патрабуем прыняць безадкладна больш рашучыя меры да кулакоў, спагнаць увесь збор да 1-га сакавіка. Дабейцеся рашучага пералому ў рэалізацыі пазыкі на вёсцы, забясьпечце нарастаючыя тэмпы работы.

Правых апартуністаў з віцебскага райкаапсаюзу —да адказнасьці

ВІЦЕБСК. (Наш кар.). Віцебскі райкаапсаюз ганебна правальвае мабілізацыю сродкаў. **План асобнага квартапу быў выканан каапсаюзам на... 5 проц.** —замест 161.000, сабрана толькі 8.030 руб. Але і гэтыя «посьпехі» апартуністы з каапсаюзу зналілі занадта вялікімі і зусім спынілі ўсякую работу. У выніку на 13 лютага з вызначаных плянам першага квартану 226.000 руб. не сабрана ні капейкі. За правал кампаніі на праўленьне каапсаюзу ўжо накладаліся розныя спагнаньні па партыйнай і савецкай лініях, але гэта не дапамагло.

Трэба рашуча ўдарыць па прапанапартуністычнай практыцы праўленцаў і ў першую чаргу старшыні праўленьня каапсаюзу **Кавалёва.** Вінаватыя ў срыве мабілізацыі сродкаў павінны быць прыцягнуты да суровай адказнасьці.

Скончыўся ўсесаюзны зьезд МОПР'у

Скончыўся ўсесаюзны зьезд МОПР'у. Зьезд абраў Цэнтральны Камітэт МОПР'у СССР. Ад Беларусі ў ЦК МОПР'у СССР абраны т. т. ВАРОНІЧАЎ, ЦУДЗІН і КАРАШКОВА (батрачка—Віцебскага раёну). У члены рэвізыйнай камісіі ЦК ад БССР уваійшоў тав. ВІШНЕЎСКІ.

Аб антысавецкіх выступленьнях пана Галуйко

Мы зьяўляемся зараз сьведкамі новай кампаніі супроць Савецкага Саюзу, якую разгортваюць капіталістычныя краіны. На гэты раз гэта кампанія вядзецца вакол так званай «прымусовай працы», якая быццам ужываецца у нашай краіне.

Таксама, як і год таму назад, калі па заклику паны рымскага, увесь сьвет быў ахопле дзікай антысавецкай сьлепымскай, так і цяпер разьліваюцца нагкі выдумак і новых легенд пад дымовай заслонай якіх ядзецца ліквідаваць падрыхтоўка да эканамічнай блакады СССР, да ўзброенага нападу на нашу краіну.

У гэтай абстаноўцы ўзрастаючай небясьпекі вайны, ва ўмовах, калі апошні працэс «Прампартыі» выкрыў антысавецкія імпэрыялістычныя пляны Францыі, Польшчы і г. д., калі ні для каго не зьяўляецца сакретам, што фашысцкая Польшча ў гэтых плянах адыгрывае першаступоную ролю — бязумоўную палітычную цікавасьць набываюць розныя выступленьні прадстаўнікоў польскага фашызму на тэмы аб яго знешняй і ўнутранай палітыцы. Гутарка будзе ісьці аб апошніх выступленьнях Галуйко, Галуйко, аднаго з выдатных прадстаўнікоў пануючай фінансавай эгры у Польшчы. Зусім яшчэ нядаўна ён займаў адказны пост начальніка Усходняга Аддзелу Міністэрства Замежных Спраў Польшчы. Зараз гэты пан выступае ў ролі «прадстаўніка» Усходніх крэсаў, у ролі «апякуна» беларускага народу. Паводле ўласнага прызнаньня ў сваёй апошняй прамове ў сойме, Галуйко быў галоўным арганізатарам выбараў у сойм на Ўсходніх «крэсах», г. зн. у чатырох паводзінах Заходняй Беларусі. Такім чынам, мы маем справу з адным з кіраўнікоў упраўнай і зьнешняй палітыкі польскай дзяржавы. Тым большую цікавасьць набываюць выступленьні, прысьвечаныя у апошні час, галоўным чынам, «беларускай праблеме», пытаньням нацыянальнай палітыкі фашысцкай дыктатуры.

Усе гэтыя выступленьні Галуйко пачуваюцца яскравымі дакумантамі, якія сьведчаць аб імпэрыялістычных імкненьнях польскага фашызму, накіраваных супроць Савецкага Саюзу. У даным выпадку сьмяшыкрыцьцё ідзе па лініі аднаго з надзвычай адказных вучастку працы польскага фашысцкага рабо[illegible] нацыянальнай палітыкі. Нідзе, бадай, з такой яркасьцю не выступаюць агрэсыўныя імпэрыялістычныя пляны польскага фашызму, як іменна ў гэтай галіне яго ўнутранай і зьнешняй палітыкі. Федэралістскія пляны, пляны захопу Савецкай Украіны і Савецкай Беларусі, ня зыходзяць з парадку дня фашысцкай і сацыял - фашысцкай прэсы. Яшчэ ў часе працэсу «СВУ», таксама як і зараз, пры арышце групы беларускіх нацдэмаў, роля Польшчы выступала, як роля галоўнага арганізатара кудацка - нацыяналістычных элемэнтаў, як роля галоўнага інсьпіратара антысавецкіх выступленьняў і антысавецкай работы нацдэмаўскай контр - рэвалюцыі. Разам з гэтым, і пляны ўнутранай нацыянальнай палітыкі разьлічаны на падрыхтоўку Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі да ролі пляцдарма ў антысавецкай вайны і ажыцьцяўляюцца шляхам жорсткага нацыянальнага ўціску, карных экспэдыцый, крывавага тэрору ў саюзе з буржуазна-кулацкімі, нацыянал - фашысцкімі элемэнтамі Заходняй Беларусі і Зах. Украіны.

Апошнае выступленьне Галуйко ў сойме, як і ўсе яго напярэдніх выступленьні ў прэсе на тэму аб Заходняй Беларусі, нацьвярджаюць усё сказанае намі вышэй. Яны падкрэсьліваюць бязумоўную актывізацыю ўсёй палітыкі польскага фашызму на Зах. Беларусі і Зах. Украіне. Яны гавораць аб тым, што пад выглядам чарговых ласкавых «словесных трюков» польскі фашызм узмацняе націск на масы прыгнечаных народаў, пры адначасовым імкненьні яшчэ больш умацаваць свой саюз з нацыяналістычнай контр-рэвалюцыяй. Ясна, што польскія фашысты ўзмоцнена імкнуцца паказаць становішча на Зах. Беларусі, як становішча ледзь не «зямнога раю», дзе пануе «мир и во человецех благоволение». **Гэта патрэбна для таго,** каб скрыць гадзечу, якая панае ў Зах. Беларусі, разьлюшаны тэрор акупантаў, скрыць сыстэму карных экспэдыцый, скрыць, урэшце, ліквамаваньні ваенных работы.

Усё гэта і робіць палітычны шулер Галуйко ў сваіх выступленьнях. Савецкі чытач, якога нельга ашукаць дэмагагічнымі фразамі і пляшчотнымі тэзамі ў голасе, ня можа бяз сьмеху чытаць тыя месцы ў прамове Галуйко, у якіх ён хваліць становішча Зах. Беларусі, выступаючы, як «бацька» і «апякун» усяго беларускага народу. Мы падамо тут некаторыя вытрымкі з гэтых выступленьняў. Вось як малюе становішча сёраз на Зах. Беларусі Галуйко:

... «Зараз наступіла там (на ЗБ) карэнная перамена. Адміністрацыя адносіцца да насельніцтва аб'ектыўна, ёсьць нармальныя самаўрады...

... Школьная справа таксама зрабіла вялікія крокі наперад...

... Мы, г. зн. фашысты, ішлі на выбары не пад лёзунгам абяцаньняў, але пад лёзунгам таго, што зрабілі ўжо нашы ўрады...

... Партыя, якую я ў даны момант прадстаўляю, ідзе да беларускага народу

Да Міжнароднага жаночага камуністычнага дня работніц

Раённым выканаўчым камітэтам БССР

Міжнародны жаночы камуністычны дзень — 8 сакавіка, дзень мабілізацыі мільённых мас працоўных жанчын усіх краін на адзіны фронт клясавай барацьбы супроць капіталізму — у гэтым годзе будзе праходзіць на ўмовах вялізарнага разгортвання сацыялістычнага будаўніцтва, якое праводзіцца пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, ва ўмовах, калі разгорнутае сацыялістычнае будаўніцтва зьнішчае рэшткі капіталістычных элемэнтаў, што выклікае шалёную нянавісьць клясавых ворагаў, як унутры СССР, так і з боку імпэрыялістычных дзяржаў, якія рыхтуюцца да ўзброенага нападу на Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

Складаныя задачы, якія стаяць перад партыяй і пралетарыятам па выкананьні пляну сацыялістычнага будаўніцтва, 3-га рашаючага году пяцігодкі, на ўзмацненьні абароназдольнасьці краіны, па інтэрнацыянальным выхаваньні працоўных і бязьлітасным змаганьні з контрэвалюцыйным нацдэмакратызмам, супроць шавінізму усіх колераў і ў першую чаргу супроць вялікадзяржаўнага расійскага шавінізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, патрабуюць правядзеньня Міжнароднага жаночага камуністычнага дня — 8-га сакавіка — як масавай палітычнай кампаніі, пад мёзунгам мабілізацыі актыўнасьці жаночых мас на выкананьне чарговых палітычных і гаспадарчых задач, намечаных апошнімі пленумамі ЦК і ЦКК УсеКП(б) і пленумам ЦК КП(б)Б.

За апошні год дасягнуты значныя посьпехі ў справе ўцягваньня працоўных жанчын у сацыялістычнае будаўніцтва, узрасла колькасьць работніц у складзе рабочай клясы, павялічыўся ўдзел калгасніц у справе калгаснага будаўніцтва, значна ўзрасла актыўнасьць работніц і сялянак у перавыбарчай кампаніі саветаў, і павялічылася іх удзельная вага ў складзе гарадзкіх саветаў, палепшылася культурнае і бытавое становішча работніц і сялянак.

Разам з гэтым, работа сярод жанчын яшчэ непастарчальна ўкаранена ў штодзённую дзейнасьць савецкіх, гаспадарчых, каапэрацыйных і грамадзкіх арганізацый, непастарчальна праводзіцца работа на вылучэньні жанчын на кіруючую работу, слаба пастаўлена работа на кваліфікацыі работніц, бытавое абслугоўваньне работніц усё яшчэ адстае ад тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва.

Выходячы з вышэйзазначанага, прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР прапануе правесьці наступную работу да Міжнароднага жаночага камуністычнага дня — 8 сакавіка—у 1931 годзе:

1. Наркаматам, раённым выканаўчым камітэтам і саветам, гаспадарчым, каапэрацыйным і грамадзкім арганізацыям у час падрыхтоўкі да 8 сакавіка правесьці самаправерку выкананьня дырэктыў партыі і ўраду ў галіне ўцягненьня працоўных жанчын у сацыялістычнае будаўніцтва, па паляпшэньні працы і быту работніц і сялянак, па вылучэньні работніц і сялянак на кіруючую работу, падрыхтоўцы кадраў для паасобных галін сельскай гаспадаркі (жывёлагадоўля, малочная гаспадарка і інш.), арганізуючы вакол гэтай праверкі актыў работніц, батрачак, калгасніц і працоўных сялянак; арганізаваць шырокае масавае абмеркаваньне вынікаў праверкі і далейшых мерапрыемстваў па паляпшэньні работы сярод жанчын, адначасова мабілізуючы ўвагу саміх работніц і працоўных сялянак на паляпшэньне работы бытавых устаноў.

2. Гарадзкім саветам, сумесна з прафэсыянальнымі і гаспадарчымі арганізацыямі, праверыць становішча кваліфікацыі работніц, намецідь канкрэтныя мерапрыемствы да 8-га сакавіка па масавай кваліфікацыі работніц, перасоўваньні іх на больш кваліфікаваную работу ўнутры прадпрыемства, па вылучэньні лепшых ударніц па гаспадарчую работу, прэміраваньня ўдарніц, стварэньні ўдарных брыгад работніц, па ўдзеле ўсёй масы работніц у сацыялістычным спаборніцтве і ўдарніцтве, па замацаваньні работніц на прадпрыемствах да канца пяцігодкі, шырока пазуларызаваць задачы рабочае клясы на правядзеньні веснавой пасэўнай кампаніі і ўдзеле ў гэтым работніц.

Правесьці масавую работу сярод жонак рабочых па ўцягненьні іх у прамысловасьць, у работу на паляпшэньні рабочага забесьпячэньня і каапэрацыі і па развіцьці бытавых устаноў пры ЖАКТ'ах.

3. Народнаму камісарыяту асьветы, Народнаму камісарыяту аховы здароўя, каапэрацыйным і гаспадарчым арганізацыям намецідь канкрэтныя мерапрыемствы па адчышэньні да 8-га сакавіка бытавых устаноў, прадугледжаных па бюджэце на 1931 год; гарадзкім саветам сваячасова прадастаўіць памяшканьні для бытавых устаноў. Бытавым камітэтам і сэкцыям—з прыцягненьнем жанчын—членаў саветаў і актыву работніц, калгасніц — правесьці праверку скарыстаньня бытавых фондаў па паляпшэньне і пашырэньне сеткі бытавых устаноў.

Святкаваньне Міжнароднага жаночага камуністычнага дня—8-га сакавіка—па вёсцы павінна быць праведзена пад знакам шырокага ўцягненьня працоўных жанчын у калгасы, шырокага растлумачэньня сутнасьці клясавага змаганьне на вёсцы, ліквідацыі кулацтва, як клясы, на базе суцэльнай калектывізацыі, пасьпяховага выкананьня кампаніі па трактарызацыі і г. д. Асабліваю ўвагу павінна быць зьвернута на прадпасьлежнае пасэўнай кампаніі і ўвазе ля з задачамі далейшай калектывізацыі. Роля жанчыны ў гэтай справе надзвычай вялікая. Сельсаветам, праўленьням калгасаў арганізаваць суцэльнае сьвяткаваньне 8-га сакавіка калгасніцамі і аднаасобніцамі, прыстасоўваючы да дня сьвята прэміраваньне і вылучэньне лепшых ударніц; арганізаваць з боку калгасніц сустрэчныя пляны веснавой сяўбы ў тых галінах, дзе пераважнае месца займае жаночая праца (лён, гародніцтва, пасеў кораньплодаў, жывёлагадоўля і г. д.). У час падрыхтоўчай работы да 8 сакавіка арганізаваць брыгады з актыву калгасніц на работе сярод аднаасобніц з мэтай іх ўцягненьня ў калгасы і перэнапачатковыя сельска-гаспадарчыя таварыствы.

У дзень 8 сакавіка правесьці раённыя парады жанчын — членаў саветаў і выканкомаў, урачыстыя пленумы гарадзкіх і сельскіх саветаў з дакладамі аб Міжнародным жаночым камуністычным дні — 8 сакавіка, аб выніках работы сярод жанчын у 1930 годзе і мерапрыемствах, намечаных у галіне паляпшэньня працы і быту жанчын на 1931 год. На гэтых сходах павінны знайсьці свой поўны адбітак задачы абароны краіны, інтэрнацыянальнага выхаваньня працоўных, асабліва жанчын нацменшасьцяй, пытаньні нацыянальнай палітыкі партыі і ўсе палітычныя і гаспадарчыя кампаніі, якія зараз праводзяцца.

Аб выніках падрыхтоўкі і правядзеньня сьвяткаваньня райвыканкомы і гарсаветы павінны падаць адпаведныя справаздачы Цэнтральнаму Камітэту па паляпшэньні працы і быту работніц і сялянак да 20 сакавіка г. г.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Чарвякоў.**
Сакратар ЦВК БССР **А. Хацкевіч.**

На раённых зьездах саветаў

ЧАШНІКІ. (Наш кар.). Адбыўся VII зьезд саветаў Чашніцкага раёну. Работа зьезду праходзіла пад знакам жорсткай, бальшавіцкай крытыкі і самакрытыкі, мабілізацыі мас на вырашэньне задач другой бальшавіцкай вясны. У гонар зьезду калгаснікі і аднаасобнікі-беднякі і сераднякі арганізоўвалі чырвоныя абозы са збожжам, ільном і інш.

Калгаснікі, беднякі і сераднякі ў прывітаньнях зьезду абяцалі, што яны па-бальшавіцку выканаюць задачы другой бальшавіцкай сяўбы, ажыцьцёвяць адозву ЦК УсеКП(б) і СНК БССР аб кантрактацыі, яшчэ больш згуртуюцца вакол камуністычнай партыі і пад яе кіраўніцтвам пойдуць да новых перамог.

Зьездам выбрана 30 членаў і 12 кандыдатаў РВК. Пасланы прывітальныя тэлеграмы ЦК УсеКП(б), т. т. Сталіну, Барашылаву, ЦК КП(б)Б і ЦВК БССР.

* * *

4-ты раённы зьезд саветаў Брагінчыны ў прывітальнай тэлеграме ЦК КП(б)Б і т. Гею заяўляе: «Пад непасрэдным кіраўніцтвам ленінскай партыі Беларусі і яе ЦК, мы дасягнулі вялізарных посьпехаў ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва. Разам з гэтым Брагінскі раён мае прарыў на фронце загатовак. Абяцаем ЦК КП(б)Б, што гэты прарыў будзе ліквідаваны. Усю сваю работу мы накіруем на ажыцьцяўленьне пастаноў сьнежаньскага аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) і студзеньскага пленуму ЦК КП(б)Б. Другую калгасную вясну мы сустрэнем ва ўсёзбраеньні. Ператворым сельсаветы ў сапраўдны орган дыктатуры пралетарыяту».

УЗМАЦНІМ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫЯ ФОРМЫ ПРАЦЫ!
„СКВОЗНЫЕ" БРЫГАДЫ, ЛЕПШЫ ВОПЫТ СВАЁЙ РАБОТЫ ПЕРАДАЙЦЕ ІНШЫМ ПРАДПРЫЕМСТВАМ!

22 лютага, у 7 гадзін вечара ў залі пасяджэньняў ЦСПСБ (Пляц Волі, Дом працы, пакой № 10)

адбудзецца

канфэрэнцыя „сквозных" ударных брыгад гор. Менску.

Парадак дня:
аб месячніку паходу за ўзмацненьне сацыялістычных форм працы.
Модус прадстаўніцтва—адзін ударнік ад пяці.
Павінны таксама зьявіцца кіраўнікі „сквозных" брыгад і прадстаўнікі фабзаўкомаў.

ЦСПСБ.

Напярэдадні 13-й гадавіны РСЧА

Баявую гадавіну адсьвяткуем па-баявому

ФАБРЫКІ І ЗАВОДЫ РЫХТУЮЦЦА ДА 13-ай ГАДАВІНЫ РСЧА

Сустрэнем юбілей па-ўдарнаму

Прафэсыянальныя арганізацыі прымаюць рад мер да таго, каб дні юбілею Чырвонай арміі прайшлі пад знакам большага згуртаваньня рабочае клясы вакол генэральнай лініі партыі, пад знакам новага напаўненьня радоў КП(б)Б лепшымі ўдарникамі.

Гэтыя юбілейныя дні павінны адзначыцца наладжваньнем яшчэ больш цеснай сувязі прафэсыянальных арганізацый з сваімі падшэфнымі часьцямі, павялічыцца дапамога і ўзмацніцца шэфства над прымацаванымі палкамі і батальёнамі.

Уся работа павінна быць накіравана на выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну. Юбілей павінен быць сустрэнут на прадпрыемствах арганізацыяй новых ударных брыгад і камун імя 13-й гадавіны РСЧА.

Гэтыя брыгады і камуны павінны павесьці за сабой калёны рабочых для таго, каб дабіцца высокіх паказальнікаў для паляпшэньня якасьці прадукцыі, памяншэньня браку, эканомьнага абыходжаньня з сабекошту і ўзмацненьня барацьбы з прачамі, гультаямі і прагульшчыкамі.

Вялікую работу трэба правесьці на самых прадпрыемствах для паляпшэньня пастаноўкі вайсковай работы. Нядаўна закончыў сваю работу 2-гі ўсебеларускі зьезд Асоавіяхіму, ён прыняў рад пастаноў, якія трэба ўжо праводзіць у жыцьцё. Необходна на прадпрыемствах арганізаваць агляд асоавіяхімаўскай работы, прыцягнуць да гэтага агляду вайсковыя часьці.

У гэтыя дні, як падарунак да юбілею Чырвонай арміі, прадпрыемствы павінны даць 100% рабочых, ўцягнутых у рады Асоавіяхіму, ўцягнутых у актыўную асоавіяхімаўскую работу.

Для таго, каб замацаваць шэфства з часьцямі РСЧА, трэба пэхі прымацаваць да падразьдзяленьняў падшэфных часьці і паставіць гэту работу на рэйкі сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Шмат новых рабочых улілося ў нашы прадпрыемствы. Іх трэба азнаёміць з жыцьцём нашай Чырвонай арміі. Прадпрыемствы павінны наладзіць гутаркі ў часе перапынку, арганізоўваць выстаўкі літаратуры, экскурсіі ў падшэфныя часьці і Дамы Чырвонай арміі.

Трэба адзначыць добрую падрыхтоўку саюзу рабочых папяровай і паліграфічнай прамысловасьці, які з увагай аднёсься да гэтай кампаніі, прыступіў да арганізацыі раду вечароў з падшэфнымі часьцямі, сваячасова даў дырэктыву аб падрыхтоўцы да юбілею РСЧА і прапанаваў фабзаўкомам і мясцкомам лепшых ударнікаў-чырвонаармейцаў.

Што асабліва цэнна і нова, гэта тое, што праўленьне саюзу палічыла за лепшае больш цесна зьвязацца з ніза-вым армейскім друкам, дапамагчы вайсковым часьцям выпусьціць іх шматтыражкі і лялічкі.

Праўленьне лічыць, што прадпрыемствы павінны зараз-жа прыступіць да арганізацыі сацспаборніцтва шляхам заключэньня сацдагавораў на лепшае выкананьне прамфінпляну на прадпрыемствах і плянаў баявой падрыхтоўкі ў падшэфных часьцях.

Таксама як саюз рабочых папяровай і паліграфічнай вытворчасьці нашы прафарганізацыі па-ўдарнаму павінны спаткаць юбілей Чырвонай арміі.

Будзем варашылаўцамі

У клюбе друкароў ажыўленьне. Сабраліся рабочыя, работніцы—друкары-сталінцы на сход, прысьвечаны 50-гадоваму юбілею К. Я. Варашылава.

Пасьля дакладу адзін за другім прадстаўнікі цэхаў друкарні аднадушна ўступаюць у арганізаваны атрад Асоавіяхіму імя Варашылава. Сталінцы ўзялі на сябе абавязак выўчыць вайсковую справу, нападзіць яшчэ лепшую сувязь з Чырвонай арміяй.

Урачыста і аднадушна заключан дагавор паміж чырвонымі друкарамі-сталінцамі оі байцамі Стаўропальскага палка.

Зараз у друкарні шырока разгортваецца падрыхтоўка да юбілею Чырвонай арміі.

А. Шухардзін.

Чырвоны крыж побач з Чырвонай арміяй

Добра наладжана сувязь Магілеўскага раённага камітэту Чырвонага Крыжу з вайсковымі часьцямі Магілева.

Абсталяваны куток санітарнай дружыны, які знаходзіцца пры доме Чырвонай арміі. Трэба адзначыць, што ў адносінах арганізацыі работы па Чырвоным Крыжы № -скі артылерыйскі полк стаіць на першым месцы. Ён таксама аказаўся на першым месцы ў праведзенай Чырвоным Крыжам кампаніі па аказаньні брацкай дапамогі пацярпеўшым ад зямлятрасеньня ў Таджыкістане і сабраў 109 рублёў 87 кап.

Райкамітэт Чырвонага Крыжу са свайго боку робіць усё магчымае, каб у выпадку нападу на наш Саюз, на першым закліку нашага ўраду, стаяць у баявым радзе, на санітарную абарону краіны Саветаў.

Г-ч.

Расцягнулі вінтоўку па частках

Работу ячэйкі Асоавіяхіму пры Старарасьльскай хаце-чытальне, Копыскага раёну, трэба узяць на грамадзкі буксір.

Больш году, як не праведзена ні аднаго сходу. З вайсковымі вядамі члены ячэйкі зусім не знаёмы, ня ўносяць узносаў. Сакратар ня цікавіцца работай.

Ня лепш стаіць справа ў вайсковым кутку. Пры ім была вінтоўка, але ў выніку нядбайнасьці заг. чытальняй яе расьцягнулі па частках.

Вайсковая літаратура, якая ідзе для вайсковага кутка, застаецца ў загадчыка Габрыля на кватэры.

Райсавет! Тут патрэбна твая ўмяшальнасьць.

А. ГЕЖІН.

Па-ўдарнаму за сваю падрыхтоўку

Вялізарная частка палітскладу Беларускай Ваеннай Акругі, якая рыхтуецца да здачы залікаў за нармальную школу, абязьцціла сябе ўдарнай і ў падарунак 13-гадоваму юбілею існаваньня Чырвонай арміі датэрмінова здае іспыты.

Рэвваенсавет акругі пайшоў пасустрач жаданьню палітскладу і вызначыў дзьве праверачныя камісіі, якія дадуць заключэньні аб ступені падрыхтоўкі кожнага палітработніка.

Усе іспыты скончацца да 13 гадавіны РСЧА.

УСАЧОЎ.

На ленінградзкай фабрыцы Белдзяржкіно

— Падрыхтавана да выпуску карціна-нат», які паказвае работу бабруйскага лесаімбінату.

— Мастацкі савет фабрыкі прыняў паротка-мэтражную карціну **«Жыцьцё і вучоба № -скай нав. дывізіі»**, якая адлюстроўвае жыцьцё і быт чырвонаармейцаў.

Паведамленьні

— Культпроп Менгаркому КП(б)Б 21-II—31 г. роўна ў 5 гадз. вечара, у залі пасяджэньняў гаркому (3-ці паверх) склікае народу з нарадкам дня: 1) Даклады з месц загадчыкаў дзённых і вячэрніх рабфакаў, рабочага унівэрсытэту аб становішчы рабфаку і вячэрняга рабочага унівэрсытэту. 2) Аб рабоце пазьменных груп па вячэрніх рабфаках, вячэрнім рабочым унівэрсытэце і рабочым вячэрнім палітэхнікуме. 3) Рознае. На нараду павінны абавязкова зьявіцца загадчыкі і сакратары ячэек КП(б)Б рабфаку, рабочага вячэрняга унівэрсытэту, рабочага вячэрняга палітэхнікуму.

— **Т-ва пэдагогаў - марксыстаў.** У 19 з пал. гадз., у нам. Навукова-дасьледчага інстытуту пэдагогікі (Унівэрсытэцкі Гарадок, прыр. корпус, 1-шы паверх) —сход т-ва пэдагогаў - марксыстаў. У парадку дня: аб нацыянал - дэмакратычнай палітыцы ў галіне культурнага будаўніцтва. Даклады т. т. Папкевіча, Яворскага і Дардака.

— **Дом Камасьветы.** У 19 гадз., пак. 19,—групавая кансультацыя для прапагандыстаў пачатковых палітшкол, ВСПШ і прадметных гурткоў. «Рэканструкцыя сельск. гаспадаркі і веснавая пасэўная кампанія». У 19 гадз., пак. 24,—групавая кансультацыя для выкладчыкаў ВСПШ па палітэканоміі на тэму: «Грошы і фінансавыя звароты». Ад 19-21 гадз.—індывід. кансультацыя па гісторыі рэвал. руху на Захадзе. У 10 гадз. ран.—сэмінары рабочых прапагандыстаў.

— **Дом Пісьменьніка.** У 19 гадз. вечар, прысьвечаны сьвяткаваньню 13 гадавіны Чырвонай арміі. Парадак дня: 1) Даклад «13 год Чырвонай арміі і абарона краіны». 2) Чытка пісьменьнікамі сваіх твораў. 3) Канцэртная частка: а) выступленьне ансамблю беларускіх народных інструментаў; б) выступленьне беларускай дзяржаўнай капэлы; в) сьпевы (Сэлях і інш.); г) аркестр і гульні. Уваход па запрашальных білетаў, якія можна атрымаць у ванц. Дому.

— **ЦС СВБ БССР.** Заваткі антырэлігійнага унівэрсытэту адбудуцца ў 18 гадз., у нам. фізычнага корпусу унівэрс. гарадка.

— **Мопраўскія курсы** перанесяцца з 21 да 26 лютага, у 19 гадз., у памяшк. ЦК МОПР'у (Савецкая, 87).

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ.

Рэдакцыя і галоўная кантора Менск, Савецкая, 63.

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	13-80	Начны рэдактар	6-42
Сакратар	10-74	Галоўная кантора	7-31
Сэктар інфармацыі	6-19	Аддзел падпіскі	7-31
		Сэктар абвестак	7-31

Умовы падпіскі
(з дармовым дадаткам „Прафук")

На 1 мес.	1 р.
„ 3 мес.	3 „
„ 6 мес.	6 „
„ 12 мес.	12 „

Падпіска прымаецца ўсюды на пошце.

Плата за абвесткі:
За радок нонп. пасьля тэксту — 50 к., перад гарадзкія абвесткі—1 р. за радок. Пасьля тэксту—у два разы дарожэй. Контакторныя рахунак выдавецтва № 92|10301 у Дзяржбанку.

Абвесткі прымаюцца ў канторы выдавецтва „ЗВЯЗДА" Менск, Савецкая, 63, 2-ы паверх, тэл. 7-31.

Згубленыя і ўкрадзеныя дакументы

лічыць несапраўднымі

Вайск. біл., партыз. біл. Раготнікава Ф. С., 1265; ас. кн. Сьміл. паенкам. Шутава В. А., 1266; вайск. біл. Сьвістунова І. П., 1267; вайск. біл. № 1972 Дрыбін. РВК Кавалёва М. А., 1268, кон. карт. Данілава Г. Ф., 1269; 3 кон. карт. Грыгаранкі Я. М., 1270-1272; вайск. біл. Латушкіна М. С., 1273; вайск. біл. Віт. АВК, чл. біл № 1969 с. дрэваапр. Станкевіча А. І., 1274-1275; вайск. біл. Леп. РВК Сініцы А. І., 1276; віза Вітун. с/с Грыдзюшкі П., 1277; вайск. біл. Сьміл. паенк. Гурыновіча Я. Н., 1278; вайск. біл Сьміл. паенк. Балаўскага С., 1279; дзіц. кн. Талач. страхк. Яськова Я. С., 1280; вайск. біл. Талач. паенк. Храмачонкі Я А., 1281; кон. карт. Расон. РВК Дубкова М., 1282; каап. кн № 363 Альбрэхт. спаж. т-ва Грыглеўскага Я., 1283; явачн. карт. № 86 Гілера Н., 1284; чл. біл. № 19195 с. РЗЛ Кіселёва С. К., 1285; вайск. біл. № 1 б. Міхал. РВК, чл. біл. № 924 с. працасьв. Іванова А. Я., 1286-1287; вайск. біл. № 10 Нараўл. РВК Бондара Р. Я., 1288; вайск. біл. Нараўл. паенк. Сьцяпанава М., 1289; чл. біл. № 10056 с. працасьв. Завітневіча М. М., 1290; вайск. біл. Тугіка Ц. Ц., 1291; вайск. біл. Астр.-Гар. РВК Касьцяневіча М., 1292; мэтр. вып. Засл. міл. Паўлоўскай А. С., 1293; ячэйка Плешч. рабачк. СГС, 1294; чл. біл. с. РЗЛ, разьліковая кн., бірж. тал. Багдана, 1295; пасьв. ас. № 1072. вайск. кн. Шубіна Я. Ф., 1296; каап. кн. № 957 Нараўл. спаж. т-ва Яфімава Г. П., 1297; вайск. біл. Бярэз. паенк. Пальшука В. І., 1298; канд. карт. № 37218 Глуск. РК КП(б)Б Караля А. В., 1299; вайск. біл. № 2801 Леп. РВК Банько Я. Ю., 1300; вайск. біл. Расонск. паенк. Бальмава М., 1301; вайск. біл № 2925 Ціхацкова А. С., 1302; чл. біл. № 6254 с. працасьв. Войніч С. К., 1303; пашп. Каладзішч. с/с Каласоўскага М. Я., 1304; вайск. біл. Леп. РВК Кастрыцкага М. М., 1305; вайск. біл. Леп. РВК Хамічэнкі В. Я., 1306; вайск. біл. РВК Мазго Т. В., 1307; чл. біл. с. працасьветы Краўцова А. Д., 1308; мэтр. вып. № 11 Пухав. ЗАГС Сіроткі Т. Я., 1039; вайск. біл. Камар. РВК. Гардзіенкі А. П., 1310; вайск. біл. Расонск. паенк. Кажамячэнкі А. Я., 1311; каап. кн. Пухав. спаж. т-ва Бароліза, 1312; мэтр. вып. № 885 леп. міл. Шлепфэра Ш. В., 1313; вайск. біл. № 2327 Пашынскага К. М., 1314; парт. біл., чл. біл. № 69522 с. РЗЛ, дав. на права наш. зброі Маз. ДПУ Юшчанкі Р. І., 1315; вайск. біл. Панкрата К. К., 1316; парт. біл. № 0817693 Мен. АК КП(б)Б, чл. біл. с. СГС, чл. біл. с. паляўнічых № 325 Запольскага А. А., 1317; каап. № 30 Капатк. спаж. т-ва Хушэнскага Н. В., 1318; вайск. біл. Сьміл. РВК Нінпеля Я. Я., 1319; чл. біл. с. СГС Казлоўскага К. Я., 1320; пасьв. аб сканч. Сьмілав. 7-годкі Міхейчыка П. Я., 1321, вайск. біл. Расонск. паенк. Міжчанкі Н., 1322; пашп. № 509 Леп. міл. Аваронак Ф. Т., 1323; дав аб пр. Сьміл. с.-г. крэд. т-ва Навадворскай Х., 1324; канд. карт. № 37855 Леп. АК КП(б)Б Урбана А. Х., 1325; пазв. кн. № 2 Клясьц. спаж. т-ва Шэлення К., 1326; 2 кон. карт. Мільнічанкі М. Я., 1328; пашп. Чавуск. міл. Дынькіна Я. А., 1329; чл. біл. № 69931 Сядзельніка Я. Х. 1330; вайск. біл. № 2502 Нараўл. РВК Валодзькі Я. П., 1331; дав. аб сканч. Дужаўск. шк. Пабярэзскага У. К., 1332; мэтр. вып. Барыс. ЗАГС, пашп. Барыс. міл. Крачкоўскага М. О., 1333; кон. карт. Прыходзькі К. А., 1334; кон. карт. Чавус. РВК Дыдалава І., 1335; вайск. пасьв. Дыкагава Т. І., 1336; партыз. пасьв. Чавуск. РВК Кавалёва С. Е., 1337; каап. кн. Бярэз. спаж. т-ва Адамовіча І., 1338; чл. біл № 6/45331 с. буд., пашп. Ендрыкаеўскага У. І., 1339, вайсковы біл. Басілеўскага М. М., 1340; чл. біл. № 54245 с. СГЛР Баранава М. І., 1341; кон. карт. № 1798 Леп. РВК Рудкоўскага М. Г., 1342; мэтр. вып. Сьміл. міл. Катка П. К., 1343; чл. біл. № 0216310 Жукоўскага К. М., 1344; пасв. № 299 97-п. Абакумава В. В., 1346; чл. біл. біл. № 12341 с. СГЛР Саўковай К. П., 1347; № 1000 Гомм. ЛКСМБ, чл. б. № 1886 с. РЗЛ, вайск. біл. Мен. паенк, парт. біл. № 1298913 Фрунзэ. РК КП(б)Б, пасьв. Мен. АК ЛКСМБ Шкуркі С. Я., 1348-1353; пазв. кн. № 891 Капыльск. спаж. т-ва Беланава Я. П., 1354.

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА — Сэктар кнігараспаўсюджаньня

Вышлі з друку і паступілі ў продаж

1) **Рэзалюцыі студзеньскага пленуму ЦК КП(б)Б** — СТАР. 32 — ЦАНА 5 КАП.

2) **Шчарбакоў Пытаньні культуры і асьветы на 13 зьезьдзе КП(б)Б** — СТАР. 100 — ЦАНА 20 КАП.

Продаж ва ўсіх кнігарнях Белдзяржвыдавецтва і спажывецкай каапэрацыі.

Сёньня, 21 лютага. Паказ для Усебел. зьезду Саветаў Пач. а 6 гадз. — Беларускі другі дзяржаўны тэатр В. Кіршон. **РЭЙКІ ГУДУЦЬ** П'еса ў 5 дзеях, 12 абразох.

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" — З прычыны выключнага посьпеху яшчэ тры дні! Гукавы фільм справа **13 дзён** „ПРАМПАРТЫ" ХРОНІКА СЯЮЖНО № 1 за 1931 г. Каса—з 5 г.—Пачатак сэансаў: 7 г., 8 г. 45 м., 10 г. 30 м.

Кіно-тэатр „Культура" — **КІНО ЗАКРЫТА да 2 сакавіка.**

КІНО „Інтэрнацыянал" — Новы савецкі фільм вытв. „Працыно" **ЖАНЧЫНА Ў ЛЕСЕ** Пач. 1 сэансу ў 6 г.—Каса—з 4 г.30 м.

КІНО „Пралетары" — Апошнія 3 дні! 16, 17 і 18 лютага мастацкі фільм паводле раману ШОЛОМ-АЛЭЙХЭМА **МАБУЛ (Крывавы паток)** драма ў 9 частках. Пач. 6 г., 7 г. 30 м., 9 г., 10 г. 30 м. Каса—з 4 гадз.

КІНО „Юны Піянэр" — Два фільмы у 1 сэанс 1) **ПРЫГОДЫ АРЫШКІ** ў 5 части. 2) **Сенька Афрыканец** ў 2 части. Пач. сэансаў з 1 г. д. Каса—з 12 г.

КІНО „СПАРТАК" — 2-гі ТЫДЗЕНЬ 2-гі ігар Ільінскі ў камэдыі **ЗАКРОЙШЧЫК з ТАРЖКА** ў 6 частках. ШТОДЗЕННА 4 СЭАНСЫ Пачатак: 1 с.—у 7 г. 2 с.—у 8 г. 15 м. 3 с.—у 9 г. 30 м. 4 с.—у 10 г. 45 м. КАСА—з 5 гадз.

Пачалася **ЧЫСТКА** Белплодагароднінны.
Просьба да ўсіх рабочых, служачых і ўстаноў даваць матар'ял на супрапоўнікаў Белплодагароднінны камісіі па чыстцы апарату—Рэвалюцыйная № 3. Матар'ял прымаюцца з 9 гадз. раніцы да 3 гадз. дня.
КАМІСІЯ.

ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНЫ ВЕЧАР сустрэчы з замежнымі рабочымі — ДОМ КАМУНІСТЫЧНАЙ АСЬВЕТЫ — імя Карла Маркса 28 лютага 1931 г. Цэнтральны Камітэт МОПР'у БССР сумесна з Цэнтральным Саветам Прафэсыянальных Саюзаў БССР і Менскім гаркомам МОПР'у АРГАНІЗУЮЦЬ **інтэрнацыянальны мопраўскі вечар сустрэчы з замежнымі рабочымі,** якія працуюць на прадпрыемствах і ўстановах у гор. Менску.
ПРАГРАМА ВЕЧАРУ:
1. Даклад „3-ці рашаючы год пяцігодкі".
2. Інтэрнацыянальныя выступленьні т. т. Макса ГЕЛЬЦА, ад групы „Алярм" і замежных рабочых.
3. Выступленьне замежнай пралетарскай „сінай блюзы"—„АЛЯРМ" па сваёй праграме.
Пачатак роўна ў 7 з пал. гадз. вечара.
Пасьля адкрыцьця, уваход у залю будзе спынены.
Уваход на вечар выключна па білетах, якія выдаюцца ў Мен. гарноме МОПР'у штодзённа ад 10-4 г. дня і 6-8 вечара.
ЦК МОПР'у БССР, ЦСПСБ, МЕНСКІ ГК МОПР'у.

22-га лютага, у 7 гадзін вечара, у галоўным корпусе БДУ для выкладчыкаў рабфаку БДУ і студэнцкага актыву **адбудзецца даклад прафэсара ПАНКЕВІЧА** на тэму: **«КЛЯСАВАЯ БАРАЦЬБА Ў ПЭДАГОГІЦЫ».** Запрашаюцца выкладчыкі і студэнкі актыву усіх рабфакаў г. Менску.

МЕНСКАЯ ГАРАДЗКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ АЎТАДОРУ склікаецца СЕНЬНЯ ў 6 гадз. вечара ў памяшканьні клюбу харчавіку (рог Камсамольскай і Інтэрнацыянальнай).
Пасяджэньне фракцыі канфэрэнцыі—там-жа ў 5 гадз.
Яўка выбраных дэлегатаў абавязкова.
Запрашаецца аўтадорауські актыў.

У выпадку неакуратнага атрыманьня газэты **ЗВАНЕЦЕ** па тэлеф. № 15-42

Камісія ЦКК НК РСІ па праверцы і **ЧЫСТЦЫ БАН** склікае 22-га лютага, у 19 гадз., у анатамічным корпусе (Унівэрсытэцкі гарадок) **СХОД СТУДЭНТАЎ разам з рабочымі,** на ім будзе заслухана справаздача катэдры антрапалёгіі БАН.
На сход запрашаюцца навуковыя працаўнікі БАН, БДУ, дактары і настаўнікі.
Камісія ЦКК НК РСІ.

Цэнтральная камісія ЦКК РСІ — ПАЧЫНАЕ — **АСАБІСТУЮ ЧЫСТКУ** ПРАЦАЎНІЧОЎ АПАРАТУ **БЕЛМЯСА.**
Кампрамотуючыя матар'ялы, якія ёсьць, просьба накіроўваць у цэнтральную камісію, Менск, Рэвалюцыйная, 3.
Асабісты прыём ад 10 да 15 гадз. там-жа.
КАМІСІЯ.

ДА ЎВАГІ ПАДПІСЧЫКАЎ
часопісяў „ОГОНЕК" і „ИСКРЫ НАУКИ" з дадаткам кніг **„Всемирная история"**
Першая кніга «ВСЕМИРНОЙ ИСТОРИИ» друкуецца і ў пачатку сакавіка будзе разасланa.
З 1-га сакавіка спыняецца высылка выдавецтвам падпісчыкам, якія не заплацілі другога ўзносу: на «ОГОНЬКУ» з «ВСЕМИРНОЙ ИСТОРИЕЙ»—4 руб. і на «ИСКРАМ НАУКИ» з «ВСЕМИРНОЙ ИСТОРИЕЙ»—4 руб. 50 к.
Па ўзносах, якія паступілі са спазьненьнем, высылка часопісяў не гарантуецца.
Узносы трэба накіроўваць **толькі на пошту.**
Аніц. Выд. Т-ва «ОГОНЕК».

СЕНЬНЯ, у 7 гадз. веч., у залі пасяджэньняў ЦСПСБ (пакой № 10) **сацыяльна-бытавы сэктар ЦСПСБ сумесна з Гаркомам КП б Б і рэд. газ. „Рабочий"** склікае **ШЫРОКУЮ НАРАДУ** па пытаньні **аб рабоце закрытых разьмеркавальнікаў,** з дакладам МЦРК і сутаклядзем рабочай брыгады. Павінны зьявіцца: сакратары партарганізацый і парткомы, дырэктары прадпрыемстваў, загадчыкі сац.-быт. сэктарамі ЦК саюзаў і прадпрыемстваў, старшыні ФЗРК, заг. закрытых разьмеркавальнікаў, начальнікі прадпрыемстваў і представнікі НК РСІ, ЦРК, БКС, ВСНГ, НКГ, Гаргандлю, Гаркомзагу і наступныя добраахвотныя сэкцыі: Баюшэвіч, Хвальнюк, Довейкі М. Б., Хвалюнін М. Ш., Тарнаўскі К. Е., Левін Г. Ь., Левін А. Я., Крывашэй А. І., Гатаўскі І. Е., Гольд, Ледэр, Вайнаўз, Ёўтухоўскі І. Ф., Сандлер В. М., Прэгас Е. В., Ролюк А. А., Загельштэйн О., Штэйр І. Г., Курган Д. Я., Фаўбішэў І. М., Зуеўскі Б. К., Крупец Н. Н., Бярэн Я. М., Румянскі, Вальфсон, Чарнаўў К. В., Кантар М. А., Ромін, Жунабэрсон С. І., Ясоне Р. В., Бурштэйн Ф. Г., Сагалевіч Я. Р., Доўнар Ф. Ф., Эстэрмін, Майзель Н. А., Шайкоўскі Н. С., Кобінскі І. Х., Гілін, Поўлоў, Андрэеў, Эльтэрман Р. Г., Левін А. И., Галубёва А. І., Скарабагатых М. І., Фрыдман